

АГРАРНЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ УШАЦКАЙ ШКОЛЫ 5

АТАМНАЯ ЭНЕРГІЯ ДЛЯ ДАПАМОГІ ПЛАНЕЦЕ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 СНЕЖНЯ 2022 г. СУБОТА № 243 (29865)

## КОРАТКА

• **Мінімальная зарплата ў Беларусі з 1 студзеня вырасце да Br554.**

• Рэзідэнт ПВТ распрацаваў інфармацыйную сістэму па кіраванні выклікамі хуткай дапамогі.

• **Каля 70 абразоў Казанскай Божай Маці прадставілі на выставе ў Мінску.**

• Па праграме «Сямейны капітал» адкрыта больш за 120,9 тыс. дэпазітаў.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Беларусы сталі часцей выбіраць айчынныя санаторыі для адпачынку і аздараўлення. Калі ў 2019 годзе суадносіны беларусаў і замежных грамадзян у здраўніцах былі 60 % на 40 %, то цяпер — 75 % на 25 %. У 2019 годзе ў санаторыях было больш за 242 тысячы замежнікаў. Па выніках гэтага года чакаем крыху больш за 160 тысяч, але выручка будзе большая. Гэта сведчыць аб тым, што замежны турыст пачаў пакідаць больш грошай. Ён прыязджае на працяглы перыяд, бярэ больш дадатковых паслуг. У айчынных здраўніцах штогод адпачываюць грамадзяне прыкладна з 50 краін. Пераважная большасць з іх прыязджае на аздараўленне з Расіі. На працягу года штодзень у санаторыях знаходзілася не менш як 100 чалавек з Літвы, Латвіі і Эстоніі. Яны таксама з задавальненнем карыстаюцца паслугамі нашых санаторыяў».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СПЫНЯЦЦА НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА»

### Пра што гаварыў Прэзідэнт Беларусі на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, якое прайшло ў Бішкеку

**Сустрэча лідараў ЕАЭС адбылася як у вузкім, так і ў пашыраным складзе. У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы вызначыў стратэгічныя задачы для развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза, падкрэсліў архіважнасць далейшага паглыблення ўнутрысаюзнай інтэграцыі і неабходнасць міжнароднага пазіцыянавання ЕАЭС.**

### Без бар'ераў ва ўзаемным гандлі

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, што датычыцца стратэгічных задач, неабходна, па-першае, у найкарацейшыя тэрміны забяспечыць рэальны выхад на рэалізацыю сумесных праектаў па стварэнні сучасных вытворчасцяў — вытворчасцяў будучыні. «Гэта абавязковы элемент нашага эканамічнага суверэнітэту», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адзін крок у такім напрамку зроблены — разгледжана пытанне аб надзяленні органаў саюза паўнамоцтвамі па фінансавым садзейнічанні прамысловай кааперацыі за кошт сродкаў бюджэту ЕАЭС. Магчымасць субсідзіравання працэнтных ставак па крэдытах дазволіць вывесці фінансаванне канкрэтных прамысловых праектаў Еўразійскім банкам развіцця на якасна новы ўзровень.




Фота БелТА.

«Другое — неабходна, што б там ні было, аздаравіць крывяносную сістэму нашага саюза, — звярнуў увагу беларускі лідар, гаворачы аб фінансах. — Ужо ўсім зразумела: эпоха дамінавання долара завяршаецца. Будучыня — за гандлёвымі блокамі, разлікі ў якіх будуць рабіцца ў нацыянальных валютах. Беларусь і Расія ўжо адышлі ў асноўных разліках ад долара. Важна, каб і іншыя партнёры актыўна падключыліся да гэтага працэсу».

СТАР. 2

Ведай нашых!

**Кацярына ЛІСІЦА:**

# «АДБЫЎСЯ ТЭНІСНЫ БУМ!»



**Пяць гадоў таму ў лістападзе 2017 года ўся Беларусь, здавалася, жыла тэнісам. «Чыжоўка-Арэна» прымала фінал Кубка Федэрацыі. У вырашальным матчы сустракаліся каманды Беларусі і Злучаных Штатаў Амерыкі. Пасля серыі перамог у Кубку Федэрацыі на ўздыме былі ўсе: балельшчыкі, арганізатары, журналісты і, вядома, самі дзяўчаты. Лёс фіналу вырашаўся ў парнай сустрэчы. На жаль, цуд не здзейсніўся. Трафей дастаўся амерыканскім тэнісісткам. Але засмучаны тады не быў ніхто. Беларускія тэнісісткі разам са сваім капітанам Эдуардам Дубровым зрабілі тое, што раней падавалася немагчымым. З таго фіналу прайшло пяць гадоў, але ўспаміны дасюль такія ж яркія. Фінал Кубка Федэрацыі, здаецца, падзяліў гісторыю беларускага тэніса на «да» і «пасля».**

**Успамінаем той гарачы лістапад і аналізуем, як змяніўся айчынны тэніс, разам з генеральным сакратаром Беларускай тэніснай федэрацыі Кацярынай Лісіцай.**

СТАР. 12

Спажывец

# НОВЫ ГОД ДА НАС ІМЧЫЦЦА

### Прыцаніліся да святочнага настрою

**Як вядома, навагоднія ўрачыстасці пачынаюцца не з дванаццатым ударам гадзінніка 31 снежня. Не з шампанскага пад тост «Праводзім стары год!» за гадзіну да гэтага моманту.**
**Не з карпаратыву на працы. І нават не з ўпрыгожвання ёлкі і набыцця падарункаў. Новы год пачынаецца са штогадовага паходу на навагодні кірмаш па ёлачныя цацкі, дожджык, мішуру і іншыя атрыбуты свята.**
**І для такога паходу цяпер — самы час.**



### ДЭКОР ПА МОДЗЕ

Здавалася б, навагодніх цацак застаецца дастаткова з мінулых свят, і няма чаго грошы марнаваць — усё роўна тыдні праз два-тры ўсе гэтыя шарыкі і зайцы адпраўляцца на антрэсолі, у каморы і на балконы. І ўсё ж кожны год у снежні навагоднія кірмашы збіраюць мноства апантаных, згодных заплаціць за ўвесь гэты бляск і ззянне, за мімалётнае бутафорскае серабро і золата, за навагодні настрой. І праўда, як не абнавіць убор для ёлкі? Тым больш што каштуе ўсё гэта нядорага...

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



# «СПЫНЯЦЦА НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА»

Прэзідэнт нагадаў, што на пасяджэнні Вышэйшага савета ў маі бягучага года бакі дамаўляліся прадметна разгледзець пытанне аб ліквідацыі перашкод на ўнутраным рынку ЕАЭС. «Лічу, што ў нас у прынцыпе не павінна заставацца бар'ераў ва ўзаемным гандлі, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — Гэта сутнасць арганізацыі нашага саюза. Гэта вырашыць дзве галоўныя задачы па забеспячэнні нацыянальных рынкаў таварамі крытычнага імпарту і каардынацыі дзеянняў пры экспарце стратэгічна важных тавараў, у першую чаргу прадуктаў харчавання».

У сувязі з тым Аляксандр Лукашэнка заўважыў: сённяшняя рэальнасць такая, бо мы па-ранейшаму працягваем змагацца з наступствамі рашэнняў, якія прымаюцца ў аднабаковым парадку на нацыянальным узроўні: то лес вывезці на экспарт не можам, то міжнародных аўтаперавозчыкаў не прапускаем. «Пры гэтым пошук узаемапрымальных рашэнняў па праблемных пытаннях расцягваецца на доўгія месяцы, — удакладніў ён. — Нарад часам шмат — рашэнняў мала. Лічу, што камісія павінна максімальна ўзмацніць работу ў названым напрамку».

## Пашырэнне прысутнасці на карце свету

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці ўдзяліць першачарговую ўвагу павышэнню міжнароднага аўтарытэту і канкурэнтаздольнасці ЕАЭС. «Апошнія падзеі паказалі, што далёка не ўсе згодныя з далейшым існаваннем аднапалярнага свету, — паведаміў Прэзідэнт. — Як вынік, расце роля такіх інтэграцыйных аб'яднанняў, як ШАС, БРІКС. І наш саюз павінен ісці з імі ў нагу. Больш за тое, мяркую, настаў час для правядзення саміту краін — членаў ЕАЭС, ШАС і БРІКС. Гэтыя краіны падзяляюць нашы падыходы аб неабходнасці павагі да розных культур, поглядаў, палітычных сістэм. Магчыма, асобныя дзяржавы АСЕАН (Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі. — **«Зв.»**) захочуць узяць удзел у такой сустрэчы. Стрыжнёвымі пунктамі парадку дня саміту маглі б стаць пытанні эканамічнага ўзаемадзеяння (напрыклад, фарміраванне рэгіянальных гандлёвых блокаў, выкарыстанне нацыянальных валют), а таксама тэмы энергетыкі і бяспекі».

Дадзенае пытанне, на думку беларускага лідара, асабліва актуальна гучыць таму, што налета старшынства бярэ на сябе Расійская Федэрацыя. Прэзідэнт перакананы: пры старшынстве Расіі арганізаваць такое мерапрыемства будзе лягчэй. Ён таксама звярнуў увагу на неабходнасць дакладна і паслядоўна заяўляць аб сваёй прысутнасці на карце свету і праз далейшае пашырэнне зон свабоднага гандлю з зацікаўленымі дзяржавамі. Так, запланаваны пачатак перагавораў па заключэнні Пагаднення аб свабодным гандлі з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі Аляксандр Лукашэнка назваў знакавым палітычным крокам для ЕАЭС.

«У той час як нас спрабуюць расколоць і ізаляваць, мы планамерна пашыраем гандлёвае супрацоўніцтва з нашымі партнёрамі, — звярнуў увагу кіраўнік беларускай дзяржавы. — Ужо на завяршальным этапе — перагаворы аб зонах свабоднага гандлю з Іранам і Егіптам. На падыходзе — пачатак перагавораў з Інданезіяй і Манголіяй. Заключэнне такіх пагадненняў, акрамя эканамічных бонусаў, дэманструе марнасць спроб калектыўнага Захаду задушыць нас санкцыямі».

Прэзідэнт заўважыў, што прымітыўная штампоўка калектыўным Захадам бяздумных пакетных эканамічных санкцый супраць Беларусі і Расіі пачынае заціхаць. «Усё, што можна было забараніць і абмежаваць, нягледзячы на тое, хай і сабе на шкоду, нашы контрпартнёры ўжо зрабілі, — удакладніў ён. — Цяпер для іх прыйшоў час усведамлення і ацэнкі наступстваў. Словы пра энергетычны і харчовы крызісы ўжо гучаць з усіх трыбун».

Пры гэтым, паводле меркавання Аляксандра Лукашэнкі, не трэба быць празорцам, каб выказаць здагадку, што хутка ў асобных краінах да гэтых двух крызісаў можа дадацца і трэці — палітычны. Адпаведныя сімптомы ўжо ёсць. «Унутраныя крытычныя ацэнкі, у першую чаргу з боку насельніцтва і бізнесу, у шэрагу заходніх дзяржаў чуваць усё гучней, — звярнуў увагу ён. — Заявы ледзь не аб эканамічным калапсе ў нашых краінах змяніліся цвярозымі меркаваннямі аглядальнікаў, аналітыкаў і асобных палітыкаў аб тым, што санкцыі ўдарылі па саміх ініцыятарах значна больш».

Пры гэтым беларускі лідар адзначыў: «Мы рэальна глядзім на рэчы і не чакаем, што гэты накат у найбліжэйшай будучыні (вось заўтра) аслабне. Мы ўжо ў пэўнай ступені загартаваліся». Самае галоўнае, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, — не дапушчана падзенне ўзроўню дабрабыту грамадзян. «Дасягнута гэта ў тым ліку і дзякуючы нашым сумесным мерам па супрацьдзеянні знешняму ціску і забеспячэнню ўстойлівасці нацыянальных эканомік ЕАЭС, — канстатаваў ён. — Прынятыя ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза рашэнні дазволілі істотна знізіць негатыўны эфект ад санкцыйнага ціску і падтрымаць важныя галіны эканомікі».

Аднак спыніцца, на думку Прэзідэнта Беларусі, ні ў якім разе нельга. У сувязі з гэтым ён агучыў на саміце тыя стратэгічныя напрамкі развіцця ЕАЭС, якім трэба ўдзяліць прыярытэтную ўвагу.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

У тэму

## На палях саміту ЕАЭС Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў

### Аб заявах Меркель

Сутнасць заяў Меркель зводзіцца да таго, што тады мінскія дамоўленасці яна разглядала як магчымасць даць Кіеву час нарасціць сілавы і вайсковы рэсурс.

«Калі гэта было б так, як яна кажа, гэта агідна. Але гэта не так. І тое, як ёсць насамрэч, не проста агідна — мярзотна. Меркель... Я таксама гэтага не чакаў. І Прэзідэнт Расіі аб гэтым сказаў: ён не чакаў такога выпаду ад Ангелы Меркель. Яна паступіла дробязна, агідна. Яна жадае быць у трэндзе. Мінскія пагадненні і пазіцыя Меркель, як і іншых, у тым ліку і Парашэнкі, былі тады вельмі сур'ёзныя. Уяўляеце, пасля мінскіх пасяджэнняў увесь свет гаварыў аб тым, што нарэшце зрабілі крок і падпісалі гэтыя пагадненні. Спынілася вайна, перасталі гінуць людзі. Усе гэта пазітыўна ацэньвалі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што не ўсё так проста, як цяпер гучыць у аналагічных заявах Ангелы Меркель і Пятра Парашэнкі: «Сёння на тым фоне гаварыць пра тое, што яны з Парашэнкам, гэты Аланд (экс-прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд. — **«Зв.»** ), якога яна за руку вадзіла на маіх вачах... Яны нібыта правялі тайную аперацыю, падманулі ўсіх, перш за ўсё Расію, Пуціна і ўсіх у свеце, далі паўзу, магчымасць украінскую армію падрыхтаваць да гэтай вайны... Калі б гэта было так, гэта занадта проста. Вось падманулі, падрыхтаваліся да вайны і ваююць цяпер. Ну, калі гэта так (гэта не так), чаго тады выць і стагнаць, што ідзе вайна? Вы да яе рыхтаваліся».

### Аб умовах міру ва Украіне

У выпадку рэалізацыі мінскіх пагадненняў Украіна была б цэласнай і ніякай вайны не было б, заўважыў Прэзідэнт: «Тады можна было. Ужо вось да гэтага часу, калі б пайшлі тым шляхам, што прапаноўваў Пуцін, і дагавор быў заключаны, сёння, акрамя Крыма, Украіна была б цэласнай. Ніякай вайны не было б», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў той час перадаваў інфармацыю, пажаданні і патрабаванні ад Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна былому кіраўніку Украіны Пятру Парашэнку і наадварот. «Я неяк гаварыў, што Пуцін апошні раз перадаў Парашэнку, што дапамогуць тое, што разбурана, аднавіць. А разбурэнні былі мінімальныя. Але яны на гэта не пайшлі. Яны рыхтаваліся да вайны», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

У 2021—2022 гадах з Данбаса павінна была пачацца вайна супраць Расіі, але яна спрацавала на апярэджанне. «Мы дакладна ведаем (у найбліжэйшы час, я Пуціну сказаў, мы абнародуем гэтыя факты), як яны павінны былі пасля 2020 года — мяцяжу ў Беларусі, калі складзецца сітуацыя і выйдуць на граніцу Смаленскай вобласці з войскамі НАТА (захопяць у нас уладу), пачаць вайну супраць Расіі з Данбаса», — заявіў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, прычынай павінна было паслужыць тое, што Расія захапіла чужыя тэрыторыі. «Адтуль павінна была пачацца вайна ў 2021-м, можа, 2022 годзе. Расія спрацавала на апярэджанне. Таму не трэба Расію папракаць з-за заяў Парашэнкі, Меркель. Ілжывых заяў, што Расія пачала вайну», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што на сустрэчах з расійскім лідарам гаворка заўсёды ішла пераважна аб неабходнасці весці перагаворы для спынення канфлікту ва Украіне: «Мы заўсёды гаварылі аб дагаворы, аб спыненні вайны, аб тым, каб вайна гэта спынілася. Пра гэта мы ў цэлым гаварылі заўсёды. Памятаеце і мае выказванні, і яго, што Зяленскаму проста не даюць гэта зрабіць».

«У гэтым кантэксце мы размаўлялі. Але ніколі не абмяркоўвалі канкрэтныя тэрыторыі: Херсон, Луганск, Данецк і гэтак далей, хто каго павінен вызваліць...» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены: калі Прэзідэнт Украіны цяпер будзе патрабаваць ад Расіі выйсці з тэрыторый Херсона, Запарожжа, Луганска, Данецка, гэта значыць, што перагавораў не будзе. «Гэта папярэдняя ўмова, якая непрымальная для Расіі. На гэтым этапе, мне здаецца, Расія наогул можа не прыняць такія ўмовы: выходзьце з Запарожжа, Херсона і гэтак далей. Нельга такія патрабаванні выстаўляць Расійскай Федэрацыі. З многіх прычын», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Калі хочаце міру — трэба сесці за стол перагавораў і там у цішыні, спакоі абмяркоўваць усе пытанні: хто што павінен вызваліць — або Расія, або Украіна. Калі гэтых крокаў няма, чытай: яны не хочуць гэтых перагавораў і размоў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Аб цане на расійскі газ

«Галоўнае — роўныя ўмовы. Няхай газ будзе і 1600 долараў, як у Еўропе, не дай бог, вядома. Але аднолькава ў Расіі і Беларусі. Вось гэта для нас важны элемент. Ну, мы дамовімся», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ён і Прэзідэнт Расіі дамовіліся ў найбліжэйшы час сустрэцца па эканамічных праблемах. «Абмяркаваць пытанні бяспекі, але галоўнае — эканамічныя праблемы. Мы там будзем абмяркоўваць гэту праблему па энерганосьбітах», — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што газавыя і энергетычныя пытанні ўзнімаліся ў тым ліку і на саміце ЕАЭС, які адбыўся ў Бішкеку. «Мы гэтае пытанне другім або трэцім па парадку дня разглядалі», — сказаў ён. Усе бакі выказалі сваю пазіцыю.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў 2025 годзе партнёры ў ЕАЭС павінны выйсці на тыя адзіныя энергетычныя рынкі, у тым ліку па газе. «Ну і дамовіліся, што мы будзем спакойна ісці, на большае не здольныя. І не толькі Расія, як аказваецца, не гатовая да такіх рэзкіх рухаў, але практычна ўсе краіны, якія сёння здабываюць або купляюць, напрыклад, газ. Таму што ў двухбаковым фармаце (на дадзеным этапе будуць вырашаць адпаведныя пытанні. — **«Зв.»**). Дамовіліся, паколькі з 2025 года рынак будзе працаваць: давайце не будзем адзін аднаго тут раздзіраць, а на двухбаковай аснове ўрэгулюем гэтае пытанне. На вузкім саставе (Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. — **«Зв.»**) мы аб гэтым дамовіліся», — расказаў беларускі лідар.

### Аб разліках расійскімі рублямі

Беларусь задавальнае выкарыстанне ў міждзяржаўных разліках расійскага рубля. Нейкіх праблем у сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка не бачыць: «Калі нас вымусілі, я сказаў: «Ну і нічога, мы задаволеныя расійскім рублём».

Больш за тое, Беларусь сама выступала ініцыятарам пераходу на расійскі рубель у разліках за энергарэсурсы, нагадаў Прэзідэнт. «Мы даўно, калі помніце, Расіі прапаноўвалі: «Давайце гандляваць за расійскі рубель». — «Не, давайце за долар» (адказвалі Беларусі на згаданую прапанову. — **«Зв.»**). І мы вымушаны былі гэты долар зарабляць невядома дзе і потым плаціць за нафту, газ. Сёння нас задавальняе стан разлікаў у расійскіх рублях».

**Паводле БелТА.**

Год гістарычнай памяці

# 100 ГАДОЎ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце стартуе цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных адметнай гістарычнай падзеі. Менавіта 1922 год даў пачатак вывучэнню новага прадмета ў сценах БДУ. Курс гісторыі беларускай літаратуры распрацавалі славутыя людзі эпохі: пісьменнік Якуб Колас, акадэмік АН БССР Іван Замоцін, прафесары Яўген Барычэўскі, Міхаіл Піятуховіч і іншыя.**

Старт мерапрыемствам дасць адкрыццё 12 снежня выставы работ літаратуразнаўцаў філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31, чытальная зала). У экспазіцыю ўвайдуць падручнікі, дапаможнікі, кнігі і манаграфіі сучасных вучоных-філолагаў, якія выкладаюць на філалагічным факультэце БДУ.

15 снежня адбудзецца сустрэча студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта з членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале са старшынёй Мінскага гарадскога аддзялення Міхаілам Пазняковым. Госці раскажуць аб дзейнасці саюза, прадставяць фрагменты сваіх новых паэтычных твораў, прысвечаных Беларусі, малой радзіме і ўніверсітэту.

Па словах прафесара кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ Ірыны Казаковай, 100-годдзе вывучэння беларускай літаратуры — знакавая падзея не толькі для ўніверсітэта, але і наогул для краіны. «100 гадоў нашы студэнты слухаюць лекцыі па беларускай літаратуры. Гэта магчымасць дакрануцца да культурнай спадчыны, вытокаў гістарычнай памяці і адчуць гонар за тое, што мы — беларусы», — падкрэсліла прафесар.

Акрамя таго, у гэты ж дзень кафедра гісторыі беларускай літаратуры чакае ў госці ветэранаў працы з ліку выкладчыкаў, якія раней працавалі на дадзенай кафедры. Ва ўрачыстай абстаноўцы ім уручаць памятныя падарункі за ўклад у развіццё беларускага літаратуразнаўства.

Трэба дадаць, што з 2018 года на філалагічным факультэце БДУ функцыянуе аўдыторыя «Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі», дзе размешчаны 18 персанальных стэндаў класікаў беларускай літаратуры. Менавіта столькі культурных дзеячаў за ўсю гісторыю нацыянальнай літаратуры было ўдастоена званняў «Народны паэт Беларусі» і «Народны пісьменнік Беларусі». Восем з прадстаўленых асоб былі студэнтамі або выкладчыкамі БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Фокус — на сацыяльныя прыярытэты

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з кіруючым актывам Віцебскай вобласці, у ёй узялі ўдзел старшыні раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў, рай- і гарвыканкамаў.**


Фота БелТА.

Размова ў фармаце дыялогавай пляцоўкі прайшла ў Полацкім дзяржаўным універсітэце імя Еўфрасінні Полацкай і была сканцэнтравана на выніках адыходзячага года і перспектывах на будучы. Наталля Іванаўна падкрэсліла, што ў рабоце старшынь гарадоў і раёнаў, дэпутацкага корпусу галоўным арыенцірам нязменна застаюцца інтарэсы людзей: «У першым чытанні ў Палаце прадстаўнікоў мы разгледзелі законапраект аб бюджэце на 2023 год, ён, як і раней, захоўвае сацыяльны кірунак. Задачы, якія былі пастаўлены VI Усебеларускім народным сходам і Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у адносінах да прыярытэтных напрамкаў развіцця дзяржавы, застаюцца нязменнымі. Нягледзячы на складаныя сітуацыі ў свеце — гэта санкцыйны ціск на нашу краіну і складаную атмасферу, — ні адна сацыяльная праграма не закрыта, усе працуюць. Бюджэт прадугледжвае павелічэнне расходаў на сферу аховы здароўя, адукацыю, што сёння ў нас у прыярытэце».

Аб тым, што ад выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця залежаць фарміраванне бюджэту і далейшая рэалізацыя дзяржпраграм, Наталля Качанава нагадала таксама. Яна падкрэсліла, што, падводзячы вынікі гэтага года, відаць, якія рэгіёны спрацавалі лепш, а ў якіх ёсць недахопы, але галоўным інструментам фарміравання паспяховай эканомікі з'яўляецца раўнамернае развіццё рэгіёнаў — гэты напрамак вызначаны Прэзідэнтам і VI Усебеларускім народным сходам. Менавіта тут фарміруюцца эканоміка, чалавечы патэнцыял, ідэалогія і наша нацыя.

Старшыня верхняй палаты парламента падкрэсліла, што для камфортнага жыцця ў кожным горадзе і раёне створаны ўсе неабходныя ўмовы, існуюць вертыкаль улады і структуры, якія працуюць дзеля людзей. У якасці прыкладу Наталля Качанава прывяла пазітыўныя змены ў аграгарадку Асвея Верхнядзвінскага раёна: насельніцтва там складае ўсяго паўтары тысячы чалавек, імпульс для развіцця населенага пункта дало адкрыццё мясаперапрацоўчага цэха. За ім з'явілася кафэ, а новыя працоўныя месцы сталі моцным штуршком для развіцця сацыяльнай сферы. «Пастаўлена задача — развіццё эканомікі праз адкрыццё прадпрыемстваў і вытворчых аб'ектаў у асобна ўзятым горадзе або раёне. Мы разумеем, што, калі будзе работа і ўсе неабходныя ўмовы, людзі застануцца і будуць жыць», — заключыла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

Суайчыннікі

# З любоўю да далёкай Радзімы

## Беларусы замежжа сустрэліся ў Мінску

**У Мінску прайшло сёмае пасяджэнне Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь. У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі дзяржаўных устаноў Беларусі і кіраўнікі беларускіх дыяспар Расіі, Латвіі, Іарданіі, Іспаніі, Германіі, ЗША, Узбекістана, Эстоніі, Малдовы, Кыргызстана, Казахстана, Арменіі. Падчас пасяджэння ўдзельнікі Савета абмеркавалі шляхі далейшага супрацоўніцтва і падвялі вынікі работы за год.**



Намеснік міністра замежных спраў Ігар Назарук заўважыў, што сёння вельмі шмат робіцца для падтрымкі сувязяў з беларусамі, якія па тых ці іншых прычынах аказаліся за мяжой, а таксама для перадачы суайчыннікам матэрыялаў пра традыцыі, веды, культурныя каштоўнасці і аб'ектыўнай інфармацыі пра падзеі, якія адбываюцца ў краіне.

У многім характар узаемадзеяння з беларускімі дыяспарамі быў прадвызначаны тым, што ў Беларусі 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Дзякуючы актыўнай плённай рабоце нашым суайчыннікам удалося звярнуць увагу міжнароднай супольнасці на праблематыку захавання гістарычнай памяці. За год прайшло шмат выставак, круглых сталоў, сустрэч і іншых мерапрыемстваў, прымеркаваных да памятных дат.

Старшыня Беларускага культурнага цэнтра «Світанак» Галіна Татаранка распавяла, што сёлета ў Ташкенце прадстаўнікі дыяспары адзначылі 140-годдзе Якуба Коласа. Святкаванне не абмежавалася толькі 3 лістапада, калі ў Ташкенце да помніка класіку беларускай літаратуры былі ўскладзены кветкі і адбылося ўрачыстае мерапрыемства. На працягу месяца культурны цэнтр «Світанак» выязджаў у навучальныя ўстановы Узбекістана, маладыя людзі чыталі вершы Коласа. У гады Вялікай Айчыннай вайны Якуб Колас два гады жыў у Ташкенце. Ён быў вельмі ўражаны самабытнай краінай і яе гасцінным народам. Колас пазнаёміўся з мясцовымі пісьменнікамі. Выязджаў з імі за межы горада. У адной такой паездцы ён у захапленні ад горнага пейзажу напісаў верш «Чынган», які пасля быў перакладзены на многія мовы свету. Былі ў класіка і іншыя вершы, у якіх ён паказваў свае пачуцці, яго здзіўлялі арыкі (гідратэхнічныя збудаванні ў выглядзе арашальнага канала), Салар. І сёння ў парку ў Ташкенце, па якім Колас хадзіў у гады эміграцыі, стаіць помнік беларускаму класіку, а яго вершы на розных мовах гучаць у навучальных установах Узбекістана.

Святлана Барташэвіч прадстаўляе беларусаў Карэліі. На сёння аўтаномія аб'яднала каля трох тысяч чалавек. Арганізацыя вельмі актыўная, а яе мерапрыемствы карыстаюцца поспехам у прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. «Мы ніколі не навязваем нашу культуру. Абавязкова на нашых мерапрыемствах побач з беларускімі песнямі гучаць рускія, карэльскія і прадстаўнікоў іншых народаў. Радуе, што, калі пачынаецца фестываль, на сцэну выходзяць дзеткі ў розных касцюмах (у Карэліі пражывае 130 нацыянальнасцяў) і разам спяваюць. Я лічу, што Беларусь міралюбівая краіна, яна заўсёды выступае за развіццё сяброўскіх адносін. І гэта мы стараемся пазіцыянаваць на нашых канцэртах», — дзеліцца Святлана Яўгенаўна. Адзін з ансамбляў у Карэліі носіць назву «Дабрэнікі». Так называлася беларуская вёска, спаленая ў гады вайны разам з жыхарамі. Бабуля, якая стала салісткай гэтага калектыву — адна з жыхароў знішчанай вёскі, яе, малую, маці выкінула ў акно, і дзяўчынка змагла ўцячы. Так, у Карэліі захоўваецца памяць пра беларускую вёску, якой ужо не існуе, і наогул пра трагедыю беларускага народа.

Пра работу, якая беларусамі замежжа праводзіцца ў Год гістарычнай памяці, сведчыць і выстаўка ў Міністэрстве замежных спраў фотаработ, дасланых на фотафестываль «Мы — разам! З любоўю да Беларусі», арганізатарамі якога выступілі парламенцкая рабочая група па справах беларусаў замежжа, МЗС, Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. На яго было даслана больш за 400 работ.

Удзельнікі пасяджэння Кансультатыўнага савета пры МЗС Беларусі па справах беларусаў замежжа таксама пабывалі ў Палаце прадстаўнікоў на сустрэчы з кіраўніком рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа Валянцінай Ражанец. Падчас сустрэчы былі падведзены вынікі фотафестывалю і лаўрэаты атрымалі дыпломы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Факт

# Карупцыянераў больш не стала...

**Кожны год у Беларусі раскрываюць ад паўтары да дзвюх тысяч карупцыйных злачынстваў. Такую лічбу назваў Ігар Грэйба, начальнік упраўлення па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генеральнай пракуратуры, падчас прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы.**

Ігар Грэйба ўдакладніў, што ўдзельная вага карупцыйных злачынстваў у агульнай структуры злачыннасці ў сярэднім складае каля 2 %. Але калі параўноўваць сітуацыю гэтага года з мінулым, то колькасць такіх злачынстваў на 35 % больша. Пры гэтым прадстаўнік Генпракуратуры падкрэсліў: гаворка не ідзе пра тое, быццам краіну накрыла хваля карупцыі — проста выяўляць такія дзеянні сталі больш актыўна.

— Органамі пракуратуры ў мінулым перыядзе 2022 года па выніках 750 праверак выканання антыкарупцыйнага заканадаўства ўнесена 1920 актаў нагляду, узбуджана 72 крымінальныя справы, да адказнасці прыцягнута 2542 службовыя і юрыдычныя асобы, — падзяліўся статыстыкай начальнік упраўлення.

Паводле слоў Ігара Грэйбы, больш за ўсё карупцыянераў дзейнічае ў сферах сельскай гаспадаркі, прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, гандлю і адукацыі.

— Шкода ад карупцыйных злачынстваў склала 19 мільёнаў рублёў, «жывымі» грашыма яе пакрылі на 48,2 %. Пры гэтым кошт маёмасці, на якую накладзены арышт, дазволіць забяспечыць яе поўнае пакрыццё, — адзначыў прадстаўнік пракуратуры.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ААН папярэдзілі аб рэкордным голадзе ў Заходняй і Цэнтральнай Афрыцы



Эксперты папярэдзілі, што колькасць галадаючых у Заходняй і Цэнтральнай Афрыцы можа налета дасягнуць рэкорднага ўзроўню 48 мільёнаў чалавек. Пра гэта паведамляецца на сайце Цэнтра навін ААН. Паводле апошніх звестак Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО), Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) і Сусветнай харчовай праграмы (СХП) ААН, больш за 35 мільёнаў чалавек, у тым ліку 6,7 млн дзяцей, зараз не ў стане задаволіць свае асноўныя патрэбы ў ежы. На думку экспертаў, іх колькасць можа ўзрасці, калі ў найбліжэйшы час не будуць прыняты тэрміновыя меры для пераадолення крызісу. «Перспектывы харчовай бяспекі на 2023 год выклікаюць крайнюю трывогу, і гэта павінна стаць апошнім трывожным званком для ўрадаў рэгіёна і іх партнёраў», — заявіў рэгіянальны дырэктар СХП ААН у Заходняй Афрыцы Крыс Нікай. Спецыялісты звяртаюць увагу на тое, што даступнасць прадуктаў харчавання зніжаецца, а цэны на ўгнаенні растуць, што можа негатыўна адбіцца на ўраджаі ў наступным годзе і пагоршыць і без таго цяжкую сітуацыю для мясцовых жыхароў Заходняй і Цэнтральнай Афрыкі.

## Палата прадстаўнікоў ЗША адобрыла абаронны бюджэт на рэкордную суму звыш $855 млрд

Гэты бюджэт на 8 працэнтаў перавышае папярэдні — за 2022-і фінансавы год — і прадугледжвае выдзяленне на 45 мільярдаў долараў сродкаў больш, чым вясной запытваў Белы дом, паведаміла Defense news. У тым ліку плануецца $800 млн на ваенную дапамогу Украіне, у рамках якіх Пентагон можа заключаць кантракты на пастаўкі новай зброі і экіпіроўкі. Акрамя таго, размова ідзе аб выдзяленні $10 млрд на ваенную дапамогу ўладам Тайваня. Раней стала вядома, што профільныя камітэты Палаты прадстаўнікоў і Сената ўзгаднілі праект абароннага бюджэту ЗША на 2023-і фінансавы год. Адзначалася, што ЗША выдзеляць $6 млрд на так званую еўрапейскую ініцыятыву стрымлівання. У заяве камітэтаў адзначалася, што гэта на $2,1 млрд больш чым запыт, які складаў $3,9 млрд: «міжнародны парадак сутыкаецца з выклікамі».

## Першыя манеты з партрэтам Карла III паступілі ў абарачэнне ў Вялікабрытаніі

У паштовыя аддзяленні Вялікабрытаніі пачалі паступаць манеты вартасцю 50 пенсаў з партрэтам караля Карла III, там атрымаюць 4,9 мільёна такіх манет. Аб гэтым паведаміла французская газета Le Figaro са спасылкай на Каралеўскі манетны двор Вялікабрытаніі. Партрэт караля Карла III, змешчаны на аверсе манеты, стварыў скульптар Марцін Джэнінгс, упершыню гэты партрэт прадставілі ў канцы верасня. Твар манарха на манеце звернуты налева — у адпаведнасці з прынятай у Вялікабрытаніі традыцыяй, гэта значыць у бок, процілеглы папярэдніку. На рэверсе манеты намаляваны гербавыя шчыты і сімвалы чатырох народаў, якія ўваходзяць у Злучанае Каралеўства. Пры гэтым каля 27 мільярдаў манет з партрэтам каралевы Лізаветы II, якія цяпер знаходзяцца ў абароце, застаюцца законным плацежным сродкам. Le Figaro адзначае, што першыя банкноты з партрэтам караля Карла III з'явяцца ў сярэдзіне 2024-га.

# НОВЫ ГОД ДА НАС ІМЧЫЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наконт нядорага — гэта, на жаль, не так. Паштучна ўся гэтая мілата і сапраўды пераважна адносна недарагая. Але велізарны асартымент, атмасфера, клапатліва створаная маркетолагамі, ды і само прадчуванне свята (якое ахоплівае жаночую палавіну краіны двойчы ў год — перад Новым годам і 8 Сакавіка: ці трэба казаць, што большасць наведвальнікаў навагодніх кірмашоў — жаночага полу?) спрыяюць таму, што тут можна лёгка пакінуць палову зарплаты.

Але аб цэнах пагаворым пазней. А пакуль — аб навагодняй модзе. Як любая сфера, звязаная з дызайнам і творчасцю, навагодні дэкор падуладны модзе, і змяняецца гэтая мода штогод. Зараз у трэндзе пастэльныя тоны навагодняга дэкору: далікатна-блакітны і бледна-ружовы, лавандавы і фісташкавы, усе адценні ліловага і бэжавага (і гэтая тэндэнцыя, калі вы заўважылі, адлюстравана і на паліцах навагодніх кірмашоў, і ва ўборы святочных ёлак у розных установах). Далікатныя тоны і някідкія адценні заклікаць ствараць атмасферу дамашняй утульнасці — найлепш тэндэнцыю можна адлюстраваць скандынаўскім паняццем «хюге». Тэрмін паходзіць ад старажытнага нарвежскага слова, якое перакладаецца як «утульнасць» або «дабрабыт». У больш шырокім сэнсе ён азначае атмасферу камфорту і спакою, шчасце ў сваім доме, уменне запаволіцца, каб адчуць смак моманту. Такім чынам, яркія колеры цацак і мішуры, якія віталіся ў мінулыя гады, у канцэпцыю сёлетняга свята не ўпісваюцца. І менавіта ў рэчышчы гэтай канцэпцыі ў цяперашні Новы год пры ўпрыгожванні ёлкі дызайнеры раяць выкарыстоўваць вінтажныя (або псеўдавінтажныя) цацкі — быццам з дзяцінства або з бабулінага куфра. А таксама цацкі, зробленыя сваімі рукамі. Спалучаць усё гэта някідкае зачараванне (свята ўсё ж ніхто не адмяняў!) рэкамендуецца з колерамі срэбра і золата. Так ваша ёлка не будзе выглядаць зусім сціпленька.



**Навагоднія кірмашы ў гэтым годзе проста акупаваныя даўгавухімі самых розных колераў, фактур і прызначэння. Гэта ёлачныя цацкі, а таксама бірулькі, сувеніры, скарбонкі, статуэткі... Калі перад Новым годам прынесці ў свой дом фігурку труса, гэта прыцягне ў жыццё поспех у наступным годзе, кажуць прадаўцы.**

Калі казаць пра форму ёлачных цацак, сёлета варта выбіраць простыя формы — шарыкі без складанага дэкору, шышкі, ледзяшы, зорачкі. Купляць іх лепш наборамі: і з пункту гледжання эканоміі, бо наборамі танней, і з пункту гледжання эстэтыкі — стракатасць разнастайных цацак у гэтым годзе не вітаецца.

А вось самі штучныя ёлкі могуць быць як звычайнымі, зялёнымі, так і сінімі, белымі, ружовымі. І нават з чырвонай ігліцай! Ну, чырвоных, сініх і ружовых ёлак з ПВХ у нашых шыротах заўважана не было, а вось белых на навагодніх кірмашах дастаткова.

## ГАЛОЎНАЯ ГЕРАІНЯ

Каля ўвахода на навагодні кірмаш у ЦУМе — лес штучных ёлак, ялінак і высачэзных ялін. Паводле статыстыкі, штучную ёлку выбірае кожны другі сучасны гараджанін — па розных прычынах. Хтосьці — з пазіцыі іх экалагічнасці, лічачы, што выбар на карысць штучнай ялінкі захавае жыццё дрэвам жывым. Хтосьці — з меркаванняў эканоміі. Калі выраб якасны, вытворца дае гарантыю на штучную ёлку да 10 гадоў. Але звычайна ялінка служыць даўжэй. Натуральная ёлка — штогадовыя выдаткі. Штучная ж эканоміць сілы і час: не трэба ісці на ёлачны базар і марнаваць грошы — проста ўсталявалі і прыбралі. Хтосьці аддае перавагу штучнай ёлцы з ахайнасці: не любіць сухіх іголак, якія пасля «сапраўднай» ёлкі даводзіцца вымятаць з дывану і прыбіраць з канап яшчэ тыдзень, а то і месяц. Вядома, штучная ялінка не пахне ігліцай. Але гэта не крытычна.

— Я ўжо шмат гадоў стаўлю толькі штучную ёлку, — падзялілася Ксенія, наведвальніца навагодняга кірмашу ў ЦУМе. — Сёлета вырашыла купіць новую: старая праслужыла мне 12 гадоў. А каб дадаць хвойнага паху, выкарыстоўваю дома эфірныя алеі хвоі — яліны або піхты.

Выбіраць штучную ёлку прадаўцы раяць уважліва, бо гэта пакупка на гады. Перш за ўсё, з дапамогай нюху: штучная ёлка не павінна пахнуць ні гумай, ні пластмасай. Калі ёсць такі пах, выраб няякасны. Другі этап — візуальны: паміж ігліцай не павінен прагледжвацца дрот. На наступным этапе спатрэбіцца дотык: некалькі разоў правядзіце пальцамі па галінцы супраць «шэрсткі»: калі іголкі выпадаюць, ад пакупкі лепш устрымацца. І нарэшце, удакладняем у прадаўца, ці пажаранебяспечны выраб. Якасная штучная ёлка альбо робіцца з вогнетрывалага матэрыялу, альбо мае вогнетрывалае пакрыццё. Гэта вельмі важны аспект, і пра яго нельга забываць.

А наогул, крытэрыі выбару штучнай ёлкі ў кожнага свае: да вышэйназваных дадаюцца і асабістыя перавагі ў дызайне, і, часам, нечаканыя патрабаванні.

Ірына прыйшла выбіраць штучную ёлку з васьмігадовай дачкой. Больш за ўсё абедзвюх цікавіць тое, наколькі ўстойлівая крыжавіна і ці надзейна ў яе ўстаўляецца само дрэва.

— У нас у доме два каты, і кожны Новы год яны перакульваюць ёлку. Так што для нас галоўны крытэрый выбару — устойлівасць, — смяецца Ірына.

Яна кажа, што ёй важна, каб крыжавіну ёлкі зручна было ўмацаваць пры дапамозе пластыкавых бутэлек з вадой, гантэляў або іншых цяжкіх прадметаў.

Што датычыцца дэкору навагодніх ёлак, варыянтаў некалькі. Ёсць проста зялёныя, ёсць са штучным напыленнем, якое імітуе снег. Ёсць ялінкі — аналагі «блакітнага» сорту ёлак. Атрымалася знайсці ялінкі з шышкамі (можна амаль не ўпрыгожваць — толькі накінуць дожджык). Маюцца ў продажы, як ужо гаварылася, зусім белыя ялінкі рознай вышыні (пашукаць такія варта ў ГУМе) — упрыгожаныя цацкамі ў пастэльнай гаме, яны будуць выглядаць чароўна. Каштуе якасная штучная ёлка нятанна. Але калі падзяліць гэты кошт на дзесяць новых гадоў, якія ялінка гарантавана павінна праслужыць гаспадару, атрымліваецца досыць прымальна. Асабліва калі ўлічыць, што пры правільным захоўванні «дрэўца» можа пражыць і даўжэй. Пухнатая сінтэтычная ёлка айчыннай вытворчасці вышынёй 150 см з імітацыяй снегу на галінках каштуе 461 рубель. Замежны аналаг з шышкамі — 365 рублёў. Беларуская ялінка без «снегу» на галінках вышынёй 1,3 м абыдзецца ў сярэднім рублёў у 210—220. Айчынная ж «піраміда ёлачная» (маленькі аналаг тых ёлак, што ставяць на плошчах) вышынёй 240 см каштуе 1046 рублёў 52 капейкі. Зрэшты, рэальна знайсці «такую ж, але без крылаў»: з іншага матэрыялу і ў іншым дызайне, але той жа вышыні. Такі «ёлачны конус» можна набыць за 605 рублёў 88 капеек. Для эканомных ёсць маленькія сціплыя ялінкі да метра, кошт якіх пачынаецца з 42 рублёў.

## ПАЧЫМ ДЗЕД МАРОЗ?

Як ужо адзначалася, колеравая гама ёлачных цацак у гэтым годзе някідкая. Вытворчасць — часцей за ўсё Кітай, матэрыял — пераважна пластык. Пластыкавыя цацкі, якія не б'юцца, — бяспечныя (калі ў сям'і ёсць маленькія дзеці, гэты варыянт наогул адзіна магчымы), даўгавечныя і часам могуць выглядаць зусім як шкляныя. Да таго ж яны значна таннейшыя за шкло — і за гэта іх любяць спажывец. Шкляныя ёлачныя шары ў нашы дні — гэта хутчэй варыянт навагодняга падарунка. Часцей за ўсё гэты настальгічны матэрыял мае на ўвазе дызайнерскае афармленне цацкі, ручны роспіс і, зразумела, немалую цану.



Пластыкавыя шарыкі прадаюцца паштучна і ў наборах. Паштучна шарыкі дыяметрам 8 см (вытворчасць — Кітай) у ружова-фіялетавай гаме з залатым напыленнем на навагоднім кірмашы ў ЦУМе каштуюць без васьмі капеек 5 рублёў. Такога ж памеру, таксама кітайскія, таксама ў пастэльнай гаме, з буйнымі бліскаўкамі — 6,67 за штучку. Проста бліскучыя без выкрунтасаў — 4,43. Набор (каля 20 шарыкаў розных фактур — дастаткова, каб цалкам упрыгожыць невялікую ялінку) абыдзецца пакупніку ў суму парадку 25—29 рублёў. З мінулага года не сышла мода на пухнатыя ёлачныя цацкі — з пёркамі, футрам, ворсам, што, улічваючы пухнаты сімвал года, цалкам чакана. Выбар велізарны, колеравая гама ў асноўным белая (але ёсць і іншыя светлыя тоны). Каштуюць «пухнацікі» на ёлку — трусы, совы, пінгвіны і іншыя птушкі, а таксама белыя медзведзяняты — ад 8 да 25 рублёў за штучку ў залежнасці ад памеру і складанасці. Кошт дожджыку і мішуры пачынаецца з 6 рублёў (за 2,5 метра), каралі на ялінку абыдуцца ад 4,5 рубля да 15—17 у залежнасці ад даўжыні. Святлодыёдныя гірлянды, неад'емны навагодні атрыбут, каштуюць па-рознаму. Але мінімальна трэба разлічваць на 20 рублёў.

**Навагодні дэкор падуладны модзе, і змяняецца гэтая мода штогод. Зараз у трэндзе пастэльныя тоны навагодняга дэкору: далікатна-блакітны і бледна-ружовы, лавандавы і фісташкавы, усе адценні ліловага і бэжавага (і гэтая тэндэнцыя, калі вы заўважылі, адлюстравана і на паліцах навагодніх кірмашоў, і ва ўборы святочных ёлак у розных установах).**



Зразумела, навагоднія кірмашы ў гэтым годзе проста акупаваныя даўгавухімі самых розных колераў, фактур і прызначэння. Гэта ёлачныя цацкі, а таксама бірулькі, сувеніры, скарбонкі, статуэткі... Калі перад Новым годам прынесці ў свой дом фігурку труса, гэта прыцягне ў жыццё поспех у наступным годзе, кажуць прадаўцы. Дарэчы, для тых, каму больш падабаецца лічыць надыходзячы 2023-і годам Ката, ёсць і самыя розныя фігуркі катоў і кацянят. Хоць іх усё ж менш, чым трусоў.

Пад ёлку ў нашым дзяцінстве ставілі Дзеда Мароза і Снягурку. Зараз на навагодніх кірмашах Снягурак у продажы амаль няма, а вось Дзядоў Марозаў — колькі заўгодна. Каштуе зімовы чараўнік пад ёлку ў залежнасці ад убору і росту. Ад 127 рублёў за Мароза ростам з таго класічнага савецкага дзеда (памятаеце?) да 300 і больш за дзядулю вышэй.

## САКРЭТЫ НАВАГОДНЯЙ ЭКАНОМІІ

Эканомія — адно з ключавых слоў адыходзячага года. Пра тое, як сэканоміць на падрыхтоўцы да свята, ужо цяпер кажуць і пішуць літаральна ўсе. Абагульнім парады эканамістаў і псіхолагаў.

• Сэканоміць на навагодніх цацках можна, калі частку з іх зрабіць сваімі рукамі — майстар-класаў у гэтым годзе ў сацсетках шмат як ніколі. Матэрыял для такога хэндмэйду рэкамендуецца не купляць, а знайсці — дома або ў яго ваколіцах (спатрэбяцца шышкі, галінкі, рознакаляровыя ніткі, гузікі, тасьма, карункі і стужкі). Праўда, прыйдзецца выдаткавацца на клей.

• Варыянт для лянівых, але камунікабельных: памяняцца цацкамі з сябрамі. Вам за некалькі гадоў надакучылі ёлачныя цацкі, але і сябры, напэўна, не супраць абнавіць «убор» для ялінкі. Не трэба купляць — памяняйцеся! А ўлічваючы моду на вінтажныя цацкі, можна пашукаць такія ў мамы ці бабулі.

• А наогул, ёлачныя цацкі разумней за ўсё купляць... пасля Новага года (у разліку на наступны). Ёлачныя кірмашы яшчэ працуюць і распрадаюць рэшткі з вялізнымі зніжкамі. Акрамя таго, няма чэргаў і гармідару.

• І яшчэ адна парада: умейце супрацьстаяць хітрыкам маркетолагаў і ўласнаму настрою чакання свята. Каб выключыць імпульсіўныя пакупкі, загадзя, яшчэ да паходу на навагодні кірмаш, дакладна вызначыцеся з сумай, якую можаце дазволіць выдаткаваць на сустрэчу Новага года — на ёлку і дэкор, падарункі, навагодні стол і на «папесціць сябе, свята ж!». Эканамісты сцвярджаюць, што, спланаваўшы навагоднія траты, можна сэканоміць да 15—20 % святочнага бюджэту.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Сацыяльны напрамак

# Каб лячыць на патрэбным узроўні

## Якая работа па рэканструкцыі, мадэрнізацыі, аснашчэнні ўстаноў аховы здароўя вядзецца на Брэстчыне

**На бягучым тыдні ў кіраўніка дзяржавы адбылася нарада па пытаннях аховы здароўя. На пасяджэнні ўпэўнена прагучала, што ў краіне ёсць усё для таго, каб лячыць людзей на патрэбным узроўні. І сапраўды, кожны год робіцца шмат у плане рэканструкцыі, мадэрнізацыі, аснашчэння ўстаноў аховы здароўя, узводзяцца новыя бальніцы і паліклінікі. Сённяшні аповед пра тое, што зроблена ў сферы паляпшэння медыцыны на Брэстчыне за апошнія гады.**

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЛОЎСКІ** прыводзіць наступныя факты:

— Пачынаючы з 2019 года завершаны работы і ўведзены ў эксплуатацыю наступныя будаўнічыя аб'екты: станцыя хуткай медыцынскай дапамогі ў паўднёва-заходняй частцы Брэста; станцыя неадкладнай медыцынскай дапамогі па вуліцы Куйбышава ў Баранавічах; прыбудова да прыёмнага аддзялення Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі; прыбудова лячэбнага корпуса да корпуса «Б» Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы; узведзены новы медыцынскі комплекс у Брэсце.



У новым корпусе абласной дзіцячай бальніцы.

За гэты ж перыяд зроблена рэканструкцыя першага паверха тэрапеўтычнага корпуса з будаўніцтвам памяшкання для ўстаноўкі апарата МРТ у абласной клінічнай бальніцы; часткі памяшканняў пад устаноўку камп'ютарнага тамографа ў абласной дзіцячай бальніцы; будынкаў анкалагічнага дыспансера ў Пінску; памяшканняў пад эмісійны тамограф у Брэсцкім абласным анкалагічным дыспансеры; памяшканняў па вуліцы Брэсцкай у Пінску пад размяшчэнне амбулаторна-паліклінічнай службы; інфекцыйнага аддзялення Лунінецкай ЦРБ; будынка былога дзіцячага садка пад амбулаторыю ўрача агульнай практыкі ў вёсцы Лахва Лунінецкага раёна. А яшчэ праведзены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй харчовых блокаў у псіхіятрычных бальніцах «Гарадзішча» і «Крывошын» на тэрыторыі Баранавіцкага раёна, завершана мадэрнізацыя кіслародных сістэм у бальніцах Брэста, Пінска, Баранавіч, шэрага райцэнтраў. І за ўсім гэтым пералікам стаяць вялікая работа і вялікія сродкі з дзяржаўнай казны.

Скажам, у пачатку бягучага года ўведзены ў строй новы шматпрофільны медыцынскі комплекс у паўднёва-заходнім раёне Брэста. Ён вельмі патрэбны ў зарэчнай частцы горада, дзе ўжо цяпер пражывае без нечага 100 тысяч чалавек. У новых мікрараёнах працягваецца будаўніцтва жылля, таму паліклінікі ўзведзены з запасам магутнасцяў. Сёння комплекс складаецца з дарослай і дзіцячай паліклінік і жаночай кансультацыі. На будаўніцтва і закупку абсталявання накіраваны 61 мільён рублёў. Паліклінікі працуюць амаль год. За гэты час скарэкціравана і адладжана сістэма работы гарадскога транспарту — цяпер дабрацца на прыём да доктара перастала быць праблемай для любога пацыента.

Літаральна за два тыдні да ўрачыстага адкрыцця названага медкомплексу адкрылі прыбудову да абласной дзіцячай бальніцы. Хоць афіцыйна гэты будынак называецца «прыбудова», ён уяўляе з сябе чатырохпавярховы гмах агульнай плошчай 9200 квадратных метраў, разлічаны на 147 ложкаў. Тут размясціліся чатыры аддзяленні дзіцячай бальніцы. Аб'ект разам з аснашчэннем абышоўся ў 38 мільёнаў рублёў. Усё зроблена для таго, каб з любога куточка Брэсцкай вобласці пры неабходнасці даставіць дзіця і аказаць яму высокатэхналагічную дапамогу. Варта сказаць, што ўжо сёлета распачаты работы па рэканструкцыі лячэбнага корпуса гэтай бальніцы.

Новыя карпусы, аддзяленні, пабудовы ўзводзяцца не толькі ў абласным цэнтры. Летась, у канцы года, здалі новае інфекцыйнае аддзяленне Лунінецкай цэнтральнай раённай бальніцы. Увод у строй аддзялення дазволіў разгрузіць саму райбальніцу. Лунінец — адзін з аддаленых райцэнтраў Брэстчыны, і там вельмі важна было наладзіць якасную профільную медыцынскую дапамогу. Апошняе падкрэслілі пры адкрыцці аддзялення, якое аснашчана 57 кіслароднымі пунктамі і пры неабходнасці можа размясціць да 70 пацыентаў.

А перад гэтым у Лахве Лунінецкага раёна правялі рэканструкцыю былога дзіцячага садка і адкрылі амбулаторыю. Такім чынам, дзве тысячы сельскіх жыхароў атрымалі магчымасць лячыцца на месцы, а не ездзіць кожны раз у іншыя амбулаторыі альбо райцэнтр.

Сёлета работа працягваецца на рэканструкцыі другой чаргі Пінскага анкалагічнага дыспансера, на будаўніцтве паталагаанатамічнага корпуса ў Баранавічах. Паводле інфармацыі Віктара Міхалоўскага, асаблівая ўвага цяпер удзяляецца аснашчэнню рэанімацыйных аддзяленняў бальніц.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Вучыцца цікава!

# Кавуны, кальрабі і тэф

**Прыведзеныя і іншыя культуры — не асартымент прылаўкаў супермаркетаў, а аграрныя эксперыменты настаўнікаў і навучэнцаў вясковай Вялікадолецкай школы Ушацкага раёна, што на Віцебшчыне. Звычайную для нас садавіну і гародніну на школьным агародзе вырошчвалі на працягу дзесяцігоддзяў, а з 2018 года ў адзін рад з бульбай і цыбуляй сталі фіялетавая морква, брусельская капуста і лаванда.**

Ставіць эксперыменты на «сотках» ушацкай установы адукацыі школьнікі пачалі ў 2018 годзе ў межах праекта Беларускага зялёнага крыжа «Школьны сад», мэтай якога з'яўляецца развіццё сучаснага сельскагаспадарчага прадпрымальніцтва і прафесійны сацыяльны рост моладзі ў сельскіх населеных пунктах. Ідэя **настаўнікаў хіміі і біялогіі Віктара Мікалаевіча ШЫШОВА і Алены Мечыславаўны ЖУК** стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу. З таго часу прайшло чатыры гады, і праект у межах школы разгарнуўся да маштабаў, якія ўражваюць.

Сёння ўвесь педагагічны калектыў і тэхнічны персанал разам з навучэнцамі даглядаюць амаль 1,5 гектара плошчы, на якой размясціўся сад, эксперыментальны ўчастак і ўчастак асабістай вытворчасці. Адных яблынь у школе налічваецца 26 сартоў, па чатыры — груш, сліў і вішань, усяго 179 дрэўцаў. Радуюць багатым ураджаем і парэчкі з агрэстам.

У мінулым сезоне адкрыццём для вясковых аграрыяў стала фіялетавая морква, якая па якасцях лічыцца карыснейшай за ўсе астатнія сарты. Яна, як расказала Алена Мечыславаўна, мае і моцны пурпурны колер. Гэтую прыродную колеравую адметнасць гаспадыні могуць выкарыстоўваць як натуральны фарбавальнік. Інтэнсіўнасць колеру караняплода залежыць ад колькасці іонаў магнію і кальцыю, аднак пасля варкі такая морква аддае амаль увесь тон вадзе, становіцца непрывабнай знешне, таму яе ў асноўным выкарыстоўваюць у ежу ў сырым выглядзе. Вырошчваюць у школе і белую моркву, якая адрозніваецца найменшым утрыманнем цукру і падыходзіць для дыетычнага харчавання; ёсць у агародніцкай калекцыі і позняя жоўтая караняплоды — яны далі сёлета найбольшы ўраджай.

Вырасцілі вялікадольчане і амаль паўтоны капусты: кальрабі, савойскай, чырвонакачаннай, брусельскай, брокалі. Правялі эксперымент і з сортам «Раманеска» з сямейства квяцістай капусты — яе качаны падобныя да пірамідак, суквецці нагадваюць марскія ракавіны — хочацца любавацца, а не есці. Яе, дарэчы, нярэдка садзяць на клумбах, упісваючы дзіўныя качанчыкі ў ландшафтныя кампазіцыі.



Дайшлі эксперыментатары з паўночнага рэгіёна і да афрыканскіх культур: сёлета на школьным участку вырасцілі тэф. На жаль, злакавая расліна з-за халодных умоў надвор'я ў бягучым сезоне не дала ўраджаю, але закаласілася. У некаторых краінах тэф, радзімай якога з'яўляецца Эфіопія, выкарыстоўваецца ў ежу ў выглядзе зерня, у некаторых яго пераціраюць у муку і выпякаюць хлебныя вырабы.

Па словах настаўніка хіміі і біялогіі Віктара Шышова, галоўнай мэтай праекта з'яўляецца не толькі навучанне дзяцей тэарэтычным асновам землеробчых работ, але і прамое ўцягванне школьнікаў у працэс. «Важна, каб дзеці разам з настаўнікамі адсочвалі ўвесь шлях раслін ад семечка да паўнавартаснага ўраджаю», — расказвае Віктар Мікалаевіч. Працэс раслінаводчых работ у школе амаль не спыняецца: ужо ў канцы зімы пачынаюць вырошчваць расаду — насенне ўстанове адукацыі ў межах праекта «Школьны сад» бясплатна пастаўляе Зялёны Крыж. Потым пераносяць яе ў 10-метровую полікарбанатную цяпліцу, яна з'явілася ў школе таксама ў межах праекта, як і халадзільная камера-сховішча на тону яблыкаў.

Бульбай, белакачаннай капустай, цыбуляй, морквай і яблыкамі ўстанова адукацыі забяспечвае сябе на цэлы год. Рэалізоўваюць лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі на восеньскіх ярмарках. Школьная садавіна і гародніна карыстаюцца попытам і маюць аўтарытэт у мясцовых жыхароў.

На эксперыментальным участку для дзяцей малодшага ўзросту настаўнікі праводзяць экаэкскурсіі, а пачынаючы з пятага класа вучні далучаюцца да работы на агародзе на летняй практыцы. Сваімі аграрнымі тэхналогіямі педагогі з радасцю дзеляцца з бацькамі дзяцей: у школе праходзяць выставы незвычайнай вырашчанай прадукцыі, Віктар Мікалаевіч ладзіць майстар-класы па прышчэпцы дрэўцаў. Для дзяцей праходзяць абавязковыя дэгустацыі: вельмі даспадобы малым салодкія паласатыя кавуны, за якімі даглядалі ўсе разам. Не раз даследчыя работы навучэнцаў і настаўнікаў займалі прызавыя месцы на абласных, міжнародных конкурсах і навуковых канферэнцыях. Пераймаць вопыт у вялікадолецкіх педагогаў прыязджаюць і калегі з вобласці.

Так званага аграрнага класа, які апошнім часам пачаў з'яўляцца на базах устаноў адукацыі, у Вялікадолецкай школе няма, затое ёсць магчымасць атрымаць пасля 11 класа спецыяльнасць агародніка — шэсць гадзін на тыдзень для старшакласнікаў Віктар Мікалаевіч (які па прафесіі яшчэ і аграном) праводзіць заняткі, у канцы выпускнога класа моладзь здае кваліфікацыйны экзамен і атрымлівае адпаведнае пасведчанне.

У планах настаўніцкага дуэта Віктара Шышова і Алены Жук — вырасціць на аптэкарскім школьным агародзе ставіо. А намер паказаць навучэнцам, што раслінаводства — справа цікавая і захапляльная, у іх ужо ажыццяўляецца.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота газеты «Патрыёт».**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 21.12.2022 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 441/С-9293 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад швейный), общая площадь – 757,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, 49, с двумя котлами отопительными («Акватор» твердотопливный с водяным контуром КОТВ ТУ BY 590884987.002-2012);<br>- капитальное строение, инв. № 441/С-9124 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада кирпичного, конторы), общая площадь – 876,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, 49/1.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422950100001002958, площадью 0,3642 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания швейного склада и здания склада кирпичного, конторы), находящемся по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, 49. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3,5, площадью 0,3642; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь 0,0135 га.<br>Условия оплаты – 100 % предоплата |
| **Начальная цена продажи** | 65 220 руб. (шестьдесят пять тысяч двести двадцать рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 522 руб. (шесть тысяч пятьсот двадцать два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 19 декабря 2022 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.03.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 21.12.2022 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение с инвентарным номером 441/С-14676 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание колбасного цеха), площадь – 409,9 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 47/1;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 441/С-16125 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание гаражей), площадь – 83,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 47, корп. 1.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый номером 422950100001002959, находящемся по адресу: Гродненская обл., г. Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 41, площадь – 0,3784 га, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания колбасного цеха.<br>Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использований земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиационному загрязнению (зона) проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3,5 площадь – 0,3784 га, земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0344 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код 5,2, площадь – 0,0618 га.<br>Условия оплаты – 100 % предоплата |
| **Начальная цена продажи** | 43 560 руб. (сорок три тысячи пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 356 руб. (четыре тысячи триста пятьдесят шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 19.12.2022 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.03.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Термотехстрой», г. Минск, пр-т Победителей, д. 117, пом. 42 |
| № лота | Предмет электронных торгов |
| 1 | **Казино (Помещение для организации азартных игр)**, общ. пл. 779,2 кв. м, инв. № 500/D-978816933, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 11-328 |
| **Начальная цена (с НДС) – 974 000 долл. США***<br>(1 250 долл. США за 1 кв. м) | |
| 2 | **Торговое помещение** (торговое помещение), общ. пл. 6 088,3 кв. м, инв. № 500/D-978816931, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 11-327 |
| **Начальная цена (с НДС) – 6 392 715 долл. США***<br>(1 050 долл. США за 1 кв. м) | |
| Шаг торгов – 2 % от текущей цены лота.<br>***Примечание:** цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона | |
| **Задаток 2 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете «Звязда» 01.10.2022 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.12.2022 г. с 11.00 до 13.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **22.12.2022 до 17.00** | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. Email: info@ipmtorgi.by** |

# РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

## извещает о проведении 12.01.2023 г. открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 333/С-12628 общей площадью 324,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Горочичский с/с, д. Бобровичи, ул. Лесная, 6. Назначение: здание склада; наименование: здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 322381200601000028 площадью 0,0445 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 53 827,20 бел. рубля, задаток – 5 382,72 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, СТ «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 2 967,64 бел. рубля, задаток – 296,76 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Земельный участок с кадастровым номером 321882803601000011 площадью 0,2500 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, д. Зелёный Кряж, ул. Зелёная, 3. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания). **Начальная цена продажи – 1 464,30 бел. рубля, задаток – 146,43 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Изолированное помещение, инвентарный номер 500/D-231614, общая площадь 49,6 кв. м, 1968 года постройки, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Голодеда, 65-65. Назначение: квартира № 65 (прописаны граждане, договор дарения). **Начальная цена продажи – 80 595,00 бел. рублей, задаток – 8 059,50 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Изолированное помещение с инвентарным номером 620/D-122 общей площадью 53,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Комсомольская, 9-28. Назначение: квартира; наименование: квартира. Имеется зарегистрированный гражданин. **Начальная цена продажи – 76 302,00 бел. рублей, задаток – 7 630,02 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000154 площадью 0,0400 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 724,00 бел. рублей, задаток – 72,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Земельный участок с кадастровым номером 623883000043000051 площадью 0,1020 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Ветеран-7», У-68. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 6 619,80 бел. рубля, задаток – 661,98 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-19580. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: лесопильный цех, площадью 483,1 кв. м; расположенное на земельном участке, площадью 5,1105 га, с кадастровым номером 620450100001000084 по адресу: Минская область, Березинский район, г. Березино, ул. Мультана, д. 106. Составные части и принадлежности отсутствуют. **Начальная цена продажи – 42 670,80 бел. рубля, задаток – 4 267,08 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-223868 общей площадью 41,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/6. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: домик из комплекта. Составные части и принадлежности: А1/сп – домик из комплекта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 13 032,00 бел. рублей, задаток – 1 303,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-37775 (назначение – здание специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – материальный склад), площадью 207,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620450100001000191 по адресу: Минская область, Березинский район, г. Березино, ул. Мультана, 62/Б2. Составные части и принадлежности: одноэтажное бревенчатое здание материального склада А/д. **Начальная цена продажи – 11 880,00 бел. рублей, задаток – 1 188,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-37430 общей площадью 403,9 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Верхнеолбянский с/с, 9/4, здание механических мастерских. Назначение – здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование – здание механических мастерских. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание механических мастерских с ограждением. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321880400001000005 площадью 4,0359 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 24 336,00 бел. рублей, задаток – 2 433,60 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Капитальное строение с инвентарным номером 311/С-32652 общей площадью 2 378,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Жгунский с/с, аг. Жгунь, ул. Советская, 62А. Назначение: здание специализированное розничной торговли; наименование: торговый центр. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное с техническим подпольем здание торгового центра с надворными постройками: складом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321282003606000085 площадью 0,3281 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеются действующие договоры аренды*. **Начальная цена продажи – 355 680,00 бел. рублей, задаток – 35 568,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708150221 общей площадью 93,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 26-94. Назначение: административно-торговое помещение; наименование: административно-торговое помещение. *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 296 352,00 бел. рублей, задаток – 29 635,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение (здание) с инвентарным номером 631/С-63205 общей площадью 76,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 621300000001001874 площадью 1,2546 га. Литер В1/д, год постройки 2010. Назначение: здание гостиниц, мотелей. Наименование: Дом рыбака № 3. Адрес расположения: Минская область, Вилейский район, Хотенчицкий с/с, д. Щарка, ул. Центральная, 5/1 **Начальная цена продажи – 34 884,00 бел. рублей, задаток – 3 488,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-26978 общей площадью 4 071,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/19. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склады ядохимикатов, удобрений. Составные части и принадлежности: А1/к – склады ядохимикатов, удобрений. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 площадью 9,0631 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 511 488,00 бел. рублей, задаток – 51 148,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 16. Объект недвижимого имущества в составе:

1. Жилой дом с инвентарным номером 333/С – общей площадью жилых помещений (согласно ведомости технических характеристик, составленной по состоянию на 28.09.2021) 297,4 кв. м и примыкающие к нему хозяйственно-бытовые постройки, расположенные по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14. Назначение: здание одноквартирного жилого дома. (Объект не принят в эксплуатацию.)

2. Земельный участок с кадастровым номером 322350100003004175 площадью 0,1024 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Спортивная, 14. **Начальная цена продажи – 72 681,96 бел. рубля, задаток – 7 268,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 17. Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-54625 общей площадью 2143,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, пр-т Мира, 21а. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание центра спорта и отдыха. Составные части: двухэтажное каменное здание центра спорта и отдыха с подвалом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003005083 площадью 0,5748 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 2 960 640,00 бел. рублей, задаток – 296 064,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 18. Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000155 площадью 0,0396 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 716, 76 бел. рубля, задаток – 71,68 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона, либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 12.01.2023 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27 в рабочие дни: пн. – чт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, пт. – с 09.00 до 13.00, с 14.00 до 15.00.

**Окончание приема заявлений – 09.01.2023 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **12 января 2023 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; +375 17 266 63 02.**

# АТАМНЫ РЭНЕСАНС

## Для аздараўлення планеты і ўстойлівай будучыні павінна развівацца ядзерная сфера

**Па прагнозах МАГАТЭ, да 2050 года ўстаноўленая магутнасць атамных рэактараў складзе каля 870 ГВт, для чаго неабходна ў шэсць разоў павялічыць аб'ём інвестыцый. У будаўніцтва крыніц тых мінімум 600 ГВт энергіі, якія мусяць быць узведзены да гэтага часу, патрэбны дзясяткі мільёнаў людзей. А пасля мільёны будуць іх эксплуатаваць і несці чыстую энергію на планету. У свеце разгортваецца сур'ёзны энергетычны крызіс, звязаны з ростам цэн на энерганосьбіты і разбурэннем лагістычных ланцужкоў. У такіх умовах атамная энергетыка можа не толькі вырашыць бягучыя праблемы, з якімі сутыкаюцца эканомікі большасці краін свету, але і стаць драйверам для развіцця на дзесяцігоддзі наперад. Пра ўсё гэта не толькі гаварылі, але і паказвалі свае дасягненні ў галіне спецыялісты з больш як 65 краін падчас XII Міжнароднага форуму «Атамэкспа», які прайшоў у Сочы пад дэвізам «Атамная вясна»: ствараючы ўстойлівую будучыню». У ім узяло ўдзел звыш 2,5 тысячы экспертаў, а вынікам шматлікіх мерапрыемстваў, што адбыліся ў межах форуму, стала падпісанне больш як 50 міжнародных дамоўленасцяў і мемарандумаў. Наша карэспандэнтка пабывала там разам з беларускай дэлегацыяй.**




**Міжурадавае пагадненне паміж Беларуссю і Расіяй аб супрацоўніцтве ў галіне абыходжання з адпрацаваным ядзерным палівам у межах міжнароднага форуму «Атамэкспа» падпісалі міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ і генеральны дырэктар Дзяржкарпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» Аляксей ЛІХАЧОЎ.**

### У МЕЖАХ САЮЗНАЙ ПРАГРАМЫ

У межах форуму было падпісана міжурадавае пагадненне паміж Беларуссю і Расіяй аб супрацоўніцтве ў галіне абыходжання з адпрацаваным ядзерным палівам (АЯП). Дакумент вызначае парадак транспарціроўкі АЯП у Расію з БелАЭС для часовага захоўвання з наступнай перапрацоўкай, а таксама вяртання ў Беларусь радыеактыўных адходаў.

Падобнае пагадненне з Беларуссю падпісана загадзя. Цяпер адпрацаванае паліва захоўваецца ў прырэактарных басейнах вытрымкі атамнай станцыі, а ўжо на мяжы 2030-х гадоў спатрэбіцца далейшае абыходжанне з ім. Менавіта на такі тэрмін у стварэнні рэгулятарнага, кантрактнага і лагістычнага ланцужкоў у перапрацоўцы беларускіх ядзерных адходаў арыентуецца расійскі перапрацоўшчык — кампанія «Тэхснабэкспарт».

Беларусь зрабіла сур'ёзны крок на шляху дасягнення энергетычнай незалежнасці, а таксама забяспечыла сябе чыстай крыніцай энергіі на дзесяцігоддзі наперад. Сёння, калі многія дзяржавы, сутыкнуўшыся з вострым дэфіцытам вугляроднага паліва і высокімі цэнамі на яго, сталі заяўляць аб рашэннях будаваць уласныя АЭС, а таксама ўносіць змяненні ў энергетычныя стратэгіі з акцэнтам на карысць атамнай энергетыкі, наша краіна ўжо валодае крыніцай атамнай энергіі, заявіў на форуме **Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі Беларусі**:

— З моманту ўключэння першага энергаблока выпрацавана ўжо 10 млрд кВт·г электраэнергіі. Гэта дазволіла замясціць 2,8 млрд $м^3$ газу, што супастаўна з 45 % гадавой патрэбы эканомікі краіны ў электраэнергіі, і прадухіліць выкід у атмасферу 4,3 млн тон парніковых газаў. З уводам другога энергаблока выкарыстанне прыроднага газу будзе працягваць памяншацца (па разліках, яго замяшчэнне дасягне 4,5 млрд $м^3$). Значны ўклад будзе зроблены і ва ўмацаванне экалагічнай сітуацыі ў плане паляпшэння клімату ў рэгіёне за кошт скарачэння выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу ў памеры больш за сем мільёнаў тон на год.

Атамная станцыя дазваляе задаволіць попыт на электраэнергію, які працягвае расці, у шэрагу сектараў эканомікі. БелАЭС надасць новы інтэлектуальны, інавацыйны, тэхналагічны імпульс развіццю энергетыкі і ў іншых галінах: медыцыне, адукацыі, электратранспарту, запэўніў міністр:

— Узаемадзеянне з Дзяржкарпарацыяй «Расатам» надалей будзе пашырацца, закранаць і прадугледжваць навукова-тэхнічнае суправаджэнне эксплуатацыі АЭС і прадаўжэнне тэрмінаў яе службы, абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам, падрыхтоўку кадраў для атамнай энергетыкі. Усе гэтыя кірункі закладзены ў саюзную праграму развіцця атамнай энергетыкі Саюзнай дзяржавы.

Міністр нагадаў таксама, што ў межах саюзнай праграмы вядзецца работа па вызначэнні цанавых умоў паставак газу ў 2023 годзе і падрыхтоўка прынцыпаў фарміравання аб'яднанага газавага рынку на перспектыву.



**Мадэль сучаснай атамнай станцыі — адзін з экспанатаў выставы на форуме.**

### ДАСЛЕДЧЫ РЭАКТАР НА ХУТКІХ НЕЙТРОНАХ

Энергетычная палітыка ў атамнай галіне спрыяе дасягненню энерганезалежнасці, павышэнню канкурэнтаздольнасці і ахове навакolля. Гэта чысты, танны і бяспечны прадукт, лічаць спецыялісты.

З атамных тэхналогій вырасла шмат лічбавых кампетэнцый і тых, што звязаны з новымі матэрыяламі: квантавыя вылічэнні, фатонныя тэхналогіі — гэта прынцыпова новы ўзровень ведаў і жыцця ў краінах свету. Аднак рэалізаваць атамны прадукт немагчыма не толькі без высокіх тэхналогій, але і без глыбокага ўзроўню эмацыянальнага даверу: асабістага і чалавечага, заўважыў **генеральны дырэктар Дзяржкарпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» Аляксей ЛІХАЧОЎ**:

— На сусветным выклікі і пагрозы атамная сям'я рэагавала згуртавана, мы практычна не разарвалі ніводнай камерцыйнай і навуковай сувязі з нашымі партнёрамі і бачым жаданне перападолець складанасці, якія сёння, на жаль, пачынаюць па розных прынцыпах падзяляць нашу планету. Такім чынам, атамная індустрыя з'явілася носьбітам рэальнага, а не дэкларатыўнага падыходу да аздараўлення планеты.

Кожнай краіне, якая бачыць сябе ў атамнай энергетыцы, патрэбны даследчы рэактар. Аднак варта памятаць, што даследчы рэактар — выраб высокай складанасці і тэхналагічнасці, а таксама вялізнай капіталаёмістасці. Даследчы рэактар, які прапануецца расійскім бокам, можа выкарыстоўвацца для многіх задач, у прыватнасці, для вырабу медыцынскіх ізатопаў і матэрыялазнаўства, расказаў **дырэктар «Русатам Бел» (краінавага офіса «Расатама» ў Беларусі) Станіслаў ЛЯВІЦКІ**.

— Мы знаходзімся ў пастаянным кантакце з Аб'яднаным інстытутам энергетычных і ядзерных даследаванняў — «Сосны» НАН Беларусі і гатовыя прапанаваць нашы рашэнні. Аднак рухацца наперад мы будзем толькі па ўзгадненні з беларускімі калегамі. Пакуль з «Соснамі» ўзгоднена канцэпцыя. Пытанне ў аб'ёмах напрацоўкі. Цяпер планаваць, зыходзячы з адносна невялікіх прагнозаў па развіцці радыефармацэўтычнай галіны ў Беларусі, не зусім карэктна. А мы павінны глядзець на перспектыву 10—20 гадоў.

Спецыялісты з многіх краін, якія хочуць увайсці ў атамную галіну, хочуць займацца і даследаваннямі, таму быў створаны кансорцыум — міжнародны цэнтр даследаванняў на базе шматмэтавага навукова-даследчага рэактара на хуткіх нейтронах, расказаў спецыяліст:

— Удзел у кансорцыуме дазваляе выкарыстоўваць час работы на дадзеным даследчым рэактары. Падобных рэактараў у свеце толькі два, трэці пакуль праектуецца. У кансорцыуме цяпер працуюць вучоныя з больш як дзесяці краін, а ў кансультацыйным савеце — 13 міжнародных арганізацый. І мы рады прапанаваць беларускім калегам працаваць у межах кансорцыума. Гэта дазволіць атрымліваць неабходныя даследаванні з непараўнальна меншымі ўкладаннямі.

### ЭНЕРГЕТЫЧНЫ МІКС З АТАМНЫХ І АДНАЎЛЯЛЬНЫХ КРЫНІЦ ЭНЕРГІІ

«Атамны рэнесанс» становіцца рэальнасцю, упэўненыя эксперты галіны. У Германіі, напрыклад, зацвярджана рашэнне працягнуць работу трох апошніх рэактараў да сярэдзіны 2023-га. Працягваюць тэрмін работы сваіх АЭС і ў ЗША. У Японіі справа ідзе да перазагрузкі атамнай энергетычнай сістэмы і думак пра будаўніцтва атамных энергаблокаў. Францыя і Вялікабрытанія намерваюцца павялічыць долю атамнай генерацыі ў сваім энергабалансе на 22 і 24 ГВт адпаведна. А Паўднёвая Карэя адмаўляецца ад ідэі закрыць атамную станцыю. Стаўку на нізкавугляродныя крыніцы энергіі робяць таксама краіны-навічкі «ядзернага клуба»: Бангладэш, Узбекістан, Казахстан, Кіргізія, Турцыя, Егіпет, Саудаўская Аравія, а таксама краіны Афрыкі. Пры гэтым у свеце не забываюцца і на аднаўляльныя крыніцы энергіі (АКЭ).

Бразілія ў 2027 годзе плануе ўвесці ў работу трэці энергаблок АЭС, якая будуецца на поўначы краіны, а таксама разглядае перспектыву выкарыстання ў аддаленых раёнах модульных атамных рэактараў малой магутнасці, расказаў **генеральны дырэктар бразільскай карпарацыі ENBPar Ней Занела дос САНТАС**:

— Бразілія ніколі не спынялася ў развіцці ядзернай энергетыкі, а заўжды выступала амаль што піянерам у гэтым кірунку і прыкладала вялікія намаганні для яго развіцця. У краіне займаюцца, у прыватнасці, здабычай уранавай руды і плануюць выраблять 2000 тон урану, а таксама пашыраць прысутнасць ядзерных тэхналогій у медыцыне і сельскай гаспадарцы. На працягу наступных 30 гадоў мы збіраемся павялічыць ядзерныя магутнасці на 10 ГВт.

Турцыі патрэбнае ўстойлівае забеспячэнне электраэнергіяй, таму яна разглядае энергетычны мікс з прыроднага газу, здабыча якога павялічылася амаль утрая, і ядзернай энергіі, якая павінна стаць неад'емным элементам энергетычнага рынку, расказаў **намеснік міністра энергетыкі і прыродных рэсурсаў Турцыі Альпарслан БАЙРАКТАР**:

— Спецыялісты прааналізавалі, што да 2053 года наша краіна стане дзяржавай з вялікай нацыянальнай эканомікай. Таму Турцыя будзе займацца лічбавізацыяй энергетычнага сектара, выкарыстоўваць увесь патэнцыял аднаўляльных крыніц энергіі і паляпшаць эфектыўнасць энергетыкі ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і іншых галінах. А яшчэ — займацца няядзернымі станцыямі. Краіне неабходна каля 20 тысяч МВт электрычнай магутнасці ад АЭС, таму Турцыя мае патрэбу яшчэ ў трох атамных станцыях.

З пункту гледжання таксанаметрыі, да зялёнай генерацыі цяпер аднесена ў тым ліку і атамная генерацыя. Яна з'яўляецца найбольш эфектыўнай з пункту гледжання выдачы магутнасці і найменш капіталаёмістай (нягледзячы на велізарныя затраты на саму атамную станцыю). Аднаўляльныя крыніцы энергіі вельмі важныя, бо перадаваць планету наступным пакаленням трэба ў тым выглядзе, у якім ёй нясорамна будзе існаваць, лічыць Станіслаў Лявіцкі:

— Аднак любая энергасістэма добрая, калі ўсе элементы генерацыі знаходзяцца ў балансе. Развіццё АКЭ ў любой краіне залежыць ад яе геаграфіі. Вятры ў Беларусі не настолькі моцныя, як, напрыклад, у Маньчжурыі, а энергію сонца варта выкарыстоўваць, калі ў краіне ёсць 200 сонечных дзён за год. У вашай краіне існуе шэраг невялікіх праектаў у сферы АКЭ, але ж удзельнічаць у іх пры існуючай тарыфнай палітыцы карпарацыі пакуль немэтазгодна. Аднак мы рады ўзаемадзейнічаць з пункту гледжання атрымання кампетэнцый і навыкаў, а таксама выкарыстання беларускіх кампаній у нашых вытворчых ланцужках.

У найбліжэйшыя 10—15 гадоў разам з будаўніцтвам энергаблокаў пакалення 3+ будзе развівацца і малая атамная генерацыя. А да сярэдзіны 2050-х вырашыцца пытанне пераходу да двухкампанентнай атамнай энергетыкі — адначасовай эксплуатацыі цеплавых і хуткіх рэактараў з замкнёным паліўным цыклам, спрагназаваў Аляксей Ліхачоў:

— У доўгатэрміновай перспектыве, праз 50 ці 100 гадоў, мы разлічваем на тэхналогіі тэрмаядзернага сінтэзу, калі чалавецтва атрымае ўнікальную крыніцу энергіі — рукатворнае сонца.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

*г. Сочы.*

Ганна МАТОРНАЯ:

# «ІМКНУСЯ, КАБ ЧАЛАВЕК МОГ ПАЗНАЦЬ СЯБЕ»

**ЗДАВАЛАСЯ, што рэжысёр Ганна Маторная будзе заўсёды ў Музычным тэатры. Там яна пачынала як дырыжор хору, пасля — рэжысёр. Артысты гатовыя былі выконваць самыя смелыя яе задумы. Там фактычна быў яе дом. Сысці прыйшлося толькі з адной прычыны: прызначылі галоўным рэжысёрам Вялікага тэатра Беларусі. Пра шлях да тэатра мы гутарым з асобай, якая шмат у чым сёння вызначае ўзровень беларускай оперы.**

— Шчыра кажучы, у мяне ніколі не было мэты стаць рэжысёрам Вялікага тэатра Беларусі. Я хацела стаць прафесіяналам. Раменснікам. Добры раменснік — гэта і ёсць майстар. Імкнулася наблізіцца да майстэрства, каб тое, што я ўмею, спатрэбілася людзям настолькі, каб пасля яны захацелі пераўтварыць сваё жыццё. І каб тое, што мы робім разам з артыстамі, стала каштоўнасцю для тых, хто гэта бачыць і адчувае. Бо калі збіраецца каманда, якая дакранаецца да шэдэўра, усведамляючы апошняе, яна стараецца і сцэнічнае ўвасабленне твора ўзняць да адпаведных вышынь. Так, ёсць людзі, якія гуртуюць і кіруюць працэсам, — вынік залежыць у вялікай ступені менавіта ад іх...

Мне падаецца, я стала больш рабіць адкрыцці, магу стратэгічна ацаніць будучыню. Не таму, што я геній, а таму, што доўга ішла па той дарозе і дасягнула мяжы, з якой шмат што бачыцца як бы здалёк. Насамрэч нічога не ўзнікае з ніадкуль. Я прыйшла ў музыку 9-гадовай дзяўчынкай. У 15 гадоў паступіла ў Гродзенскае музычнае вучылішча, пасля заканчэння пачалося сур'ёзнае прафесійнае жыццё. За плячыма — 35 гадоў штодзённай працы. І досведу — прафесійнага і чалавечага, які назапашваўся і даў вынік. І калі табе наканавана недзе быць, то лёс так ці інакш туды прывядзе.

Я веруючы чалавек, хоць і не хаджу ў царкву штодня, але мая царква — гэта мая справа.

Разумею, што Сусвет існуе па пэўных канонах, з намі нічога не адбываецца выпадкова, і людзей мы сустракаем тых ці іншых не проста так. У лёсе кожнага чалавека можна прасачыць ланцуг знакаў, падзей, якія пэўным чынам выбудоўваюць яго жыццё. Яны, як сігнальныя агні на ўзлётнай паласе ў аэрапорце. Мы можам альбо кіравацца імі, альбо рабіць выгляд, што яны свецяць не для нас — але рана ці позна прыйдзем туды, дзе нам трэба быць.

У музычным вучылішчы мяне выхоўвалі як дырыжора-хармайстра, таму я прывыкла працаваць з любым матэрыялам. У кансерваторыі атрымала багаж ведаў па самых розных галінах, без якіх немагчыма сябе лічыць культурным чалавекам, — не кажу ўжо пра тое, каб быць добрым дырыжорам і працаваць у тэатры, які мяне захапіў цалкам. Аднойчы даведалася, што Барыс Утораў, які ставіў спектаклі ў нас у Музычным тэатры, збіраецца набіраць эксперыментальны курс у Акадэміі мастацтваў, дзе будуць рыхтаваць рэжысёраў музычных тэатраў. Прыйшла да яго, бо вельмі хацела ствараць спектаклі. Ён сказаў, што гэта не жаночая прафесія. Пачула тое чарговы раз!.. Пакуль працавала дырыжорам, таксама казалі, што гэта не жаночая прафесія. Увесь час даводзілася даказваць адваротнае. Але ён быў такі аўтарытэт для мяне, што я зрабіла крок назад — адзіны ў жыцці. Я не прачытала знакі: не падумала, што гэтая прафесія патрабуе напорыстасці і рашучасці, каб той пагадзіўся. А я не пайшла на ўступныя экзамены. У выніку на курс паступілі адзін хлопец і чатыры дзяўчыны. Закончылі ж Наталля Мархель і Настасся Грыненка. Абедзве на апошнім курсе нарадзілі дзяцей...

Я паступіла ў аспірантуру, пачала пісаць дысертацыю. Да 30 гадоў стала аўтарытэтным хормайстрам, чалавекам, які мог дзяліцца вопытам і выкладаць у Акадэміі музыкі. Маё імя было ўжо даволі вядомае ў краіне.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— ...І што не дазволіла спыніцца?***

— Лёс, які дае нам патрэбных людзей. Я стала рэжысёрам дзякуючы свайму мужу. Дзякуючы яму ведаю, што такое каханне, дзякуючы яму абсалютна шчаслівая. Але ўсё здарылася не ў адно імгненне. Гэта мой трэці шлюб, ён адбыўся тады, калі я лічыла для сябе дадзеную тэму закрытай. Мы былі знаёмыя з 2000 года. Калі ён з'язджаў на год у Кітай, дамовіліся, што я буду думаць... Сустрэліся 3 ліпеня 2003 года і больш не развіталіся. З таго часу я жыву нібыта на іншай планеце, мяне нават пазбавілі хатніх клопатаў. Сяргей падтрымліваў мяне ў самыя складаныя і драматычныя моманты і аднойчы сказаў: «А чаму б табе не паспрабаваць ажыццявіць сваю мару?»

Якраз узнік спрыяльны момант. Мая памочніца Вольга Бураўлёва, з якой мы працавалі ў Музычным тэатры, вучылася ў Акадэміі мастацтваў на курсе Віталя Катавіцкага, які рыхтаваў рэжысёраў драмы. У іх на курсе з'явілася месца, але за два тыдні трэба было падрыхтавацца і здаць экстэрнам спецпрадметы за ўвесь першы курс. Мне было 32 гады — і што, вучыцца? Але муж падтрымаў, і я рашылася. А праз год мы атрымалі божы дар: калі я павінна была пайсці на чарговую сесію, нарадзілася Дар'я — гэта быў цуд...

Вельмі хутка здарыўся яшчэ адзін: я даведалася, што Маргарыта Ізворска-Елізар'ева вядзе курс рэжысёраў музычнага тэатра ў Акадэміі музыкі. А я там працягвала выкладаць і падумала, што гэта шанц. Маргарыта Мікалаеўна сказала, што так проста мяне не возьме: сумоўе, іспыты, літаральна як у казцы. Яна давала заданні, я асвойвала тэму, а потым мяне тэсціравалі па 6—8 гадзін — прытым, што дома быў сысунок (як жа нам пашчасціла з татам!). У выніку бліжэй да Новага года маё навучанне ўхвалілі.

А калі я скончыла і вярнулася ў родны тэатр рэжысёрам, давялося даказваць, што нездарма прыйшла ў прафесію. Усе мае папярэднія заслугі былі памножаныя на нуль. У 38 гадоў я пачала прафесійнае жыццё наноў. Харавікі перасталі мяне лічыць сваёй, а рэжысёры глядзелі як на выскачку. Змяніць гэта можна было толькі няспыннай працай.

У Музычным тэатры я ніколі ні ад чога не адмаўлялася. На маю думку, калі трывалае рамесніцтва накладваецца на веды, то можна казаць пра прафесіяналізм. Да пэўнага моманту я праходзіла праз випрабаванні, але гэта толькі загартоўвае. І здарыўся момант, калі я зразумела: ведаю, умею. Магчыма, таму ў мяне атрымліваюцца лёгкія спектаклі — хочацца зрабіць так, каб людзі глядзелі на жыццё з аптымізмам і паверылі ў сябе.

***— Але ёсць адчуванне, што ўзнікла прорва паміж мастацтвам і людзьмі, для якіх яно робіцца...***

— Наша задача — зрабіць так, каб чалавек, які прыйшоў у тэатр аднойчы, адтуль ужо не сыходзіў. Праўда, спектакль можна пераўтварыць у адасобленую ад чалавека гісторыю, а можна гледача ў яе ўцягнуць.

Для гэтага важны момант дасканалага вывучэння матэрыялу і ўсяго, што яго датычыцца. Я імкнуся, каб былі алюзіі з іншых відаў мастацтваў, каб чалавек мог пазнаць у ім сябе. Лічу, што трэба ствараць оперу так, каб людзі хацелі прыйсці шмат разоў — разглядзець дэталі, паглыбіцца ў дзеянне. Я вельмі люблю, калі публіка паглыбляецца ў спектакль на ўзроўні саўдзелу, выбудоўваю драматургію. Нават у оперы «Любоўны напой» спецыяльна зрабіла так, каб, седзячы ў зале, вы ўяўлялі, што знаходзіцеся на італьянскім узбярэжжы. Таму што, вывучаючы італьянскую крытыку, я зразумела, што ў оперы Даніцэці ёсць усяго адна сцэна, у якой Неморына зусім адзін — калі ён спявае Раманс. Першапачаткова прадугледжвалася, што за выключэннем згаданай сцэны ўсё дзеянне будзе ў руху.

***— Для тэатральнага мастацтва важны момант актуальнасці. Што значыць для вас актуальнасць оперы?***

— Якім чынам яна суадносіцца з тым, што адбываецца навокал? Гэта павінен адчуваць у першую чаргу рэжысёр. Выбар матэрыялу для пастаноўкі ў ідэале абумоўлены тым, што рэжысёру хочацца выказацца. Хоць у маім жыцці не заўсёды было так.

Пакуль я працавала ў Музычным тэатры, ставіла ў першую чаргу тое, што мне заказваў тэатр. Тая ж гісторыя з операй «Фаўст». Вялікі тэатр заказаў мне такую пастаноўку. Я прапанавала розныя варыянты, але выбраў мастацкі кіраўнік. Я падазравала, што работа не будзе простай: «Фаўст» — вялікая лірычная французская опера. Для мяне гэта як узяць у рукі Біблію: дакранаешся і кожнае імгненне сумняваешся, што маеш на тое права...

Я вельмі добра ведала оперу. Але пачала чытаць наноў Гётэ ўжо ў новай узроставай катэгорыі. І стала ўспамінаць музыку — на маю думку, там няма нічога лішняга. Можна нешта адрэзаць, але гэта ідэальная канструкцыя. Звычайна я не проста знаёмлюся з матэрыялам, а вывучаю ўсё, што датычыцца твора: па лістах, рэцэнзіях. Гляджу даступныя пастаноўкі. Я разумела, што не варта ставіць «Фаўста» як сярэднявечную гісторыю ў адпаведных дэкарацыях.

Вельмі ўдзячная мастаку Вячаславу Окуневу, які падтрымаў і вельмі чуйна да мяне ставіўся. Гэта была мая першая праца ў Вялікім, а ў яго безумоўны аўтарытэт: што б ні прапаноўваў — не абмяркоўвалася. Я прапанавала Окуневу канцэпцыю палёту ў часе. Таму што заўсёды ўзнікаюць пытанні: хто такі Мефістофель, хто такі Фаўст? Гаворка пра тое, што чалавек, звязаны з навукай, звычайна не верыць у Бога, ён матэрыяліст. На мой погляд, гэта пазачасавая гісторыя — не істотна, у якіх дэкарацыях яна разгортваецца. Было важна стварыць спектакль, на які б захацела прыйсці моладзь. Бо ёсць герой, якога складана пераканаць у тым, што каханне — гэта не секс, не жарсць, а духоўная існіна. І раптам для яго адкрываецца вера ў Бога. Гэта момант маўчання. Стары Фаўст нічога не спявае ў фінале, ён маўчыць. У адзін цудоўны момант усе мае спектаклі сталі пра гэта...

Выпуск «Фаўста» быў складаны: пачалася пандэмія. Выпускала спектакль адна — як рэжысёр, і за мастака-пастаноўшчыка, і за мастака па касцюмах. З тэмпературай 38. Была на мяжы псіхафізічнага знясілення. Стала дыхаць, толькі калі муж адвёз мяне на зімовыя канікулы ў Белавежскую пушчу. І гэта не выпадковасць. Было неабходна заглыбленне ў беларускую прастору: па прыездзе выклікалі наконт пастаноўкі «Дзікага палявання караля Стаха».

***— Гэтая опера ішла ў тэатры 30 гадоў, атрымала высокія адзнакі. Калі вы пачыналі гэтую працу, ці абгрунтавалі для сябе: чаму патрэбна новая пастаноўка?***

— Я не нарадзілася ў Беларусі, але Беларусь для мяне — усё жыццё. Мне выпала магчымасць гэта засведчыць. Бо ў 20 гадоў у мяне раптам уключыліся родныя рэцэптары: прачнулася любоў да рускага мастацтва. Глыбока вывучала рускую музыку, якую лічыла вялікай. Ганарылася, што з'яўляюся часцінкай Расіі. А калі ўсё, што трэба было адкрыць у гэтым кірунку, зрабіла, то адчула: мне мала і трэба адчыняць іншыя дзверы. Дыпломную работу ў кансерваторыі пісала па месе Віктара Капыцько ў гонар святога Францыска Асізскага. У выніку паглыбілася ў заходнееўрапейскую культуру — мой пакой у інтэрнаце ў той час быў застаўлены гарамі кніг. Калі скончыла кансерваторыю, прапанавалі выкладаць гісторыю замежнай харавой музыкі. А пасля ў мяне пачаўся этап сучаснай культуры, у якую таксама заглыбілася. Беларуская ўвесь час была побач — ужо свая, бо шмат мне дала. І вось надышоў час аддаваць.

Я выказала пажаданне, што хачу працаваць з мастаком Андрэем Меранковым і з мастаком па касцюмах Таццянай Лісавенкай — пасля работы над «Труфальдзіна...» ведаю, што яна мысліць канцэптуальна. Але былі іншыя прэтэндэнты, і калі намалявалі эскізы, то ўсё стала відавочна. Разам мы шмат размаўлялі пра матэрыял, але ён для мяне ніяк не адкрываўся. Звычайна я назапашваю — шукаю ключык. А тут доўга не разумела, з якога боку падысці.

Усе сакрэты насамрэч у партытуры. З дырыжорам Андрэем Івановым пачалі капаць: чаму такая драматургія оперы? Андрэй Іваноў схадзіў у госці да ўдавы кампазітара Уладзіміра Солтана, прынёс аўтарскую партытуру. Пачалі іграць — іншая музыка! Нездарма ў мяне было адчуванне, што ў творы не хапае дзеяння. Але яно яшчэ павінна быць напоўнена жыццём...

Тады муж параіў прачытаць Караткевіча па-беларуску. І я адчула атмасферу, у якой разгортваецца гісторыя. А перад прэм'ерай мы паехалі па музычныя інструменты да майстра Алеся Лася пад Ракаў. Глядзелі на беларускія краявіды, засеяныя палі. І мяне нібыта азарыла. Фінальнае азарэнне — пра любоў да радзімы, да зямлі, якая нас яднае.

***— У Вялікім тэатры вы паставілі тры розныя спектаклі. Што такое збалансаваны рэпертуар для беларускай оперы, на вашу думку: розныя музычныя эпохі, розныя культуры ды часы?***

— Як галоўны рэжысёр я павінна вырашаць шэраг задач. Па-першае: тэатр дзяржаўны, і мы працуем на інтарэсы краіны. Па-другое, ёсць трупа, і для яе развіцця трэба, каб у рэпертуары былі задзейнічаны ўсе артысты. За апошнія 10 гадоў рэпертуарная палітыка ў Вялікім тэатры была вельмі спецыфічная. Дырэктар хоча, каб у нас з'яўляліся новыя назвы.

Тут узнікае яшчэ адна акалічнасць: не ўсё, што хочацца, магчыма паставіць...

Мастацкі кіраўнік згадаў «Кацярыну Ізмайлаву» Шастаковіча. Цудоўны твор, трэба вывучыць, ці ёсць у нас для яго публіка. Галіна Галкоўская хацела б узяцца за «Набука», бо папярэднюю пастаноўку грамадскасць ужо перавярыла. Я з задавальненнем паставіла б «Любоў да трох апельсінаў» Пракоф'ева. Але не ведаю, наколькі добра будуць прадавацца квіткі на такі спектакль. Ці ўзяла б оперу «Дзідона і Эней» Пёрсела — калісьці ставіла яе як дыпломны спектакль. Гэта першая сімвалічная опера, пастаўленая ў Мінску — на сталах са студэнцкай сталовай. Але ці гатовая наша публіка ўспрымаць барочнае мастацтва?.. І ўвасобіла б оперу «Дон Жуан». Лічу, што Моцарт павінен быць у рэпертуары любога тэатра. Гэта школа для спевакоў, як выкладчык лічу, што ўсе артысты павінны спяваць Моцарта. Акрамя таго, «Дон Жуан» — касавая назва. Тым больш што ў тэатры ёсць патэнцыяльныя выканаўцы партыі Дон Жуана. І ў нас шмат жанчын: донны Ганны, донны Эльвіры, Цэрліны... Бо рэжысёр нічога не ставарае сам. Я бачу людзей — артыстаў — і на іх перапляўляюцца вобразы. Лічу, што шанц раскрыцца павінен быць у кожнага спевака, а яго задача — апраўдаць прызначэнне на ролю.

На мой погляд, самая вялікая праблема — вырашыць пытанне балансу паміж тым, што трэба тэатру, і творамі, на якія б прыходзіў глядач. Мы абавязаны думаць не толькі пра мастацтва, але і пра касу. Пры тым, што оперны тэатр заўсёды быў як футбольная каманда — сведчыў пра прэстыж краіны, якая яго падтрымлівала...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Поўны тэкст — на zviazda.by**

# Апакаліптычны жах вайны

**Мастацкі камбінат Беларускага саюза мастакоў разам з мемарыяльным комплексам «Хатынь» зладзілі сімпозіум па літаграфіі «Сляза, якая ўпала на попел».**

Галоўнай тэмай стала трагедыя насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, распавяла **дырэктар Мастацкага камбіната Беларускага саюза мастакоў Юлія АНАЦКАЯ**:

— У Год гістарычнай памяці мы вырашылі прысвяціць першы сімпозіум тэме Вялікай Айчыннай вайны. Ідэя нарадзілася ў працэсе выканання работ для музея ў Хатыні, які будзе будавацца. Мастацкі камбінат выступае праекціроўшчыкам экспазіцыі, якая размесціцца ў музеі. Мы шмат узаемадзейнічаем з дырэктарам мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Артурам Зельскім. І ў нас нарадзілася ідэя зрабіць сімпозіум па літаграфіі. Адгукнулася шмат мастакоў, усе з іх годныя графікі, — распавяла Юлія Анацкая.


Фота БелТА.

У склад творчай групы ўвайшлі беларускія мастакі, сярод якіх Андрэй Басалыга, Ігар Гардзіёнак, Юрый і Вольга Крупянковы, Алена Манько і Андрэй Піткевіч. Як адзначыла **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ**, для саюза праект вельмі важны:

— На працягу года мы развіваем тэму гістарычнай памяці ў самых розных варыяцыях, у тым ліку ўвасабляючы тэму Вялікай Айчыннай вайны вачыма сучасных мастакоў. Мова, якой выказваецца маладое пакаленне, зусім іншая. Таму творцы паспрабавалі знайсці тую сімволіку і метафары, праз якія можна паразмаўляць аб вайне сёння. Праект паслужыў штуршком для цэлай кагорты нашых графікаў. Мне здаецца, што вынік вельмі пераканаўчы.

У сваю чаргу **дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Артур ЗЕЛЬСКІ** звярнуў увагу на тое, што трагічная і жахлівая тэма вайны дае вялікі прастор для жывапісу:

— Нам, на жаль, сёння не стае рэалізму ў жывапісе. Многае мы не ўбачым на фатаграфіях — іх проста няма. І тут уступае ў сваё права наша беларуская творчасць, бо ніводная зямля ў гады Другой сусветнай вайны не перажыла тых трагедый, якія зазнала наша краіна, наш народ. Сіла мастацтва павінна данесці апакаліптычны жах усяго, што рабіла вайна на нашай зямлі не толькі з дарослымі, але і з дзецьмі. Гэта скажоная, адлучаная рэальнасць, якую мы не ўсведамляем і цяпер.



Сустрэча з удзельнікамі сімпозіума адбылася ў літаграфічнай майстэрні мастацкага камбіната: мастакі прэзентавалі ўжо гатовыя работы і падзяліліся ўражаннямі ад удзелу ў праекце. Як адзначыў **старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў Ігар ГАРДЗІЁНАК**, тэма вельмі няпростая:

— Мяркую, не знойдзецца ніводнай сям'і, якую б не закранула гэтая трагедыя: у кожнага ёсць цяжкія гісторыі, звязаныя з тым часам. І, вядома, нам, людзям, якія толькі па ўспамінах могуць перажыць і пераасэнсаваць той перыяд, даволі цяжка брацца за такія тэмы. Але праз сімвалізм, сучаснае бачанне, пластычныя формы мастацтва ў нас ёсць магчымасць выказацца. Удзел у сімпозіуме — гэта адказнасць. Мы не дакументалісты, але адсутнасць нейкіх дакументаў мы можам замяніць сваім мастацкім разуменнем.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Нясумнае чытанне

# «О, КАБ ВЕДАЎ ТЫ, ЯК ПАЛАЮЦЬ ПАХОДНІ НА СЦЕНАХ ЗАЛЫ ДЛЯ ПІРОЎ!»

## Пяць выдуманых карцін Уладзіміра Караткевіча

**У сярэдзіне снежня свет адзначае Дзень мастака... Але мастаком можна назваць і таго, хто малюе словам... Пісьменнікі на старонках сваіх твораў таксама ствараюць уражальныя карціны — партрэты, пейзажы, батальныя сцэны... Але і сапраўдныя карціны мастакоў выкарыстоўваюць. Вялікім знаўцам сусветнага мастацтва быў Уладзімір Караткевіч, які і сам добра маляваў. Сярод яго ўлюбёнцаў — Брэйгель («Што ж ты пракінуўся, мужыцкі Брэйгель? Шпурляй у твар ім горкія палотны»), Босх («Дзіўны, дзіўны мастак! У цемры сярэднявечча сядзеў ён перад мальбертам»), Гоя («Сон розуму пачвар раджае, і панствуюць яны над ім»)... Караткевіча, дарэчы, забаўляла, што ён быў вельмі падобны да партрэта хлопчыка Пінтурык'ё 1480 года — пра гэта яму яшчэ маці ў дзяцінстве сказала...**


Караткевіч быў упэўнены, што падобны да гэтага партрэта пэндзля Пінтурык'ё.

Але проста згадваць рэальныя карціны мала — ён па-майстэрску прыдумвае палотны, якія існуюць толькі ў ягоным уяўленні...

Давайце ўспомнім гэтыя неіснуючыя карціны ад Караткевіча.

### «ГАННА І ІРЫНА»

У рамане «Леаніды не вернуцца да зямлі» («Нельга забыць») вельмі шмат мастакоў і іх работ, бо ў аснове сюжэта — каханне Караткевіча да мастацтвазнаўцы Ніны Молевай, выведзенай пад імем Ірыны Горавай. Малады студэнт літінстытута, паэт Андрэй Грынкевіч, пакутуе, бо яго выкладчыца Ірына гуляе з пачуццямі: то адгукаецца, то аддаляецца... І нават знаёміць Андрэя са сваёй сястрой Ганнай, мастачкай, якая не толькі таленавітая, але яшчэ і незвычайна прыгожая, — ці каб выпрабаваць пачуцці Андрэя, ці каб ён сапраўды перанёс сваю закаханасць на прыгажуню Ганну... Так Грынкевіч трапляе ў мастакоўскі асяродак, дзе яго шчыра палюбілі — не толькі Ганна, але і яе калегі. І калі аднойчы Андрэй з'яўляецца ў майстэрні, мастакі падрыхтавалі яму падарунак:

*«Упала завеска з невялікага палатна. Андрэй, гледзячы на яго, з цяжкасцю падавіў уздых. На палатне быў салатна-зялёны, росны, увесь у сонечных зайчыках сад, трава, у якую нехта густа сыпануў залатымі манетамі адуванчыкаў. А на траве сядзелі дзве дзяўчыны. Гэта было нешта накшталт гагенаўскай ідыліі, толькі самая ідылія была мяккая, размытая, паўночная, без уласцівых поўдню грубавата-кафейных і глянцава-зялёных адценняў. Трапяткая, здаецца, ледзь дыхаючая, родная зеляніна першых дзён лета.*

*Адна дзяўчына сядзела ў траве, матаючы на рагульку вобу. У свежым тварьі, у кароне залацістых валасоў, у белай, трохі занадта па-маскараднаму простай сукенцы было нешта засцянковае, міла старамоднае.*

*Другая, у значна больш сучасным уборы, не такая прыгожая, але адухоўленая, сядзела на зэдлічку, гледзячы кудысь паўзверх раскрытай кнігі. Вусны няўлоўна ўсміхаліся, але ў схіленай, быццам пад цяжарам вузла валасоў, галоўцы, у шэрых вачах быў сум.*

*Ганна і Ірына. Два бакі адвечнага, прага якога заўсёды жыве ў мужчынскім сэрцы».*

Немагчымы выбар чакае Андрэя... Сэрца яго аддадзена не лагоднай Ганне, а здрадлівай Ірыне, чужой жонцы. Але калі Ірына паміраe, ён застаецца з Ганнай.

### ПАРТРЭТ БЛАКІТНАЙ ЖАНЧЫНЫ

У аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» вялікую ролю адыгрывае адзін партрэт... Ён адразу прываблівае ўвагу выпадковага госця маёнтка Балотныя Яліны, фалькларыста Андрэя Беларэцкага:

*«...жаночыя партрэты з пакатымі плячыма, створанымі для пяшчоты. У іх такія твары, што заплакаў бы і кат. А напэўна, хтосьці з гэтых жанчын і сапраўды склаў галаву на пласе ў тыя жорсткія часы. Непрыемна думаць, што такія жанчыны бралі ежу з блюд рукамі, а ў балдахінах іхніх спальняў гняздзіліся клапы.*

*Я стаў ля аднаго такога партрэта, зачараваны той дзіўнай незразумелай усмешкаю, якую так неперайманьна рабілі часам нашы старыя мастакі. Жанчына глядзела на мяне спачувальна і загадкава.*

*— Ты — маленькі чалавек, — як быццам казаў яе позірк, — што ты звэдаў у жыцці? О, каб ведаў ты, як палаюць паходні на сценах залы для піроў, каб ведаў ты, якая насалода цалаваць да крыві каханкаў, дваіх звесці ў бойцы, аднаго атруціць, аднаго кінуць у рукі ката, дапамагаць мужу страляць з вежы па наступаючых ворагах, яшчэ аднаго каханка амаль звесці ў магілу сваім каханнем і пасля ўзяць ягоную правіну на сябе, скласці на эшафоце сваю галаву з высокім белым ілбом і складанай прычоскай».*

Гэткае падрабязнае апісанне невыпадковае: калі Беларэцкі ўпершыню бачыць маладую гаспадыню Балотных Ялін Надзею Яноўскую, яму здаецца, што той партрэт, які ён толькі што разглядаў, ажыў... Вось толькі калі жанчына на партрэце была прыгожай, то жывы яе двайнік падаўся госцю страшэнна брыдкім... Потым мы даведаемся, што аблічча Надзеі гэтак змяніў застарэлы жах... Сярод зданяў, якія гэты жах ствараюць, прывід Блакітнай Жанчыны, той самай пані з партрэта. Паводле паданьня, гэтая прабабуля Надзеі, калі яе цягнулі на плаху, пракляла́ся адпомсціць усім нашчадкам роду Яноўскіх, вось яе прывід і з'яўляецца, калі нехта з іх мусіць памерці...

### ЮНАК З БЕЛЫМ КАНЁМ

Герой рамана «Каласы пад сярпом тваім», юны князь Алесь Загорскі, прайшоў праз старажытны абрад дзядзькавання — яго малым аддалі на некалькі гадоў выхоўвацца ў сялянскай сям'і, каб вырас няспешчаным і ведаў цану хлебу. А калі хлопчыка вярнулі ў сям'ю, пачалося арыстакратычнае выхаванне. Вось бацька паказвае сыну карцінны павільён, каб паказаць толькі адно палатно:

*«Проста перад імі вісела на сцяне даволі вялікая карціна ў цяжкай, пацьмянелай ад часу залатой раме. На карціне быў пейзаж, які не бывае, — празрыста-блакітны і няўлоўны.*

*— Мантэнья, — сказаў бацька, — славуты італьянскі мастак.*

*Пейзаж праглядаўся праз галіны высокай яблыні з залацістымі пладамі. А пад дрэвамі ішоў кудысь малады чалавек і вёў за аброць белага каня. На чалавеку была круглая шапачка; доўгія рукавы дзівоснага ўбору адносіў вецер.*

*У чалавека былі цёмна-шэрыя вочы і прамы нос.*

*— Увесь дзень думаў, на каго ты падобен, — сказаў бацька.— І вось успомніў. Ды гэта ж ты, гэта ты з белым канём. Гэта ты і Урга. Як дзве кроплі вады.*

*Ах, як не адступаў ад Алеся ўсе гэтыя дні белы конь! І ўсё гэта было як сон. І вось цяпер ён сам, сам Алесь, ішоў з белым канём у нейкую блакітную далячынь».*

Вобраз белага каня вельмі важны для рамана... Маленькі Алесь чуе песню старога Данілы пра жарабя святога Міколы... Калі тое жарабя вырасце ў гожага белага каня, на ім з'явіцца герой, які вызваліць народ ад прыгнёту. Алесь верыць, што менавіта ён будзе тым вершнікам. І хоць карціны, якую апісвае Караткевіч, не існуе, мастак Андрэа Мантэнья рэальны — ён жыў у Італіі XV стагоддзя. А на апісанне Караткевіча натхніла, магчыма, серыя карцін Мантэньі, створаных для герцагскага палаца Ганзага ў Мантуі «Трыумф Цэзара» — на фоне вайсковага парада там ёсць юнак з белым канём.

### ПАРТРЭТ ЦЫГАНКІ

У рамане «Чорны замак Альшанскі» гісторыку Антону Космічу ў разблытванні забойства ягонага сябра дапамагае сусед — палкоўнік Хілінскі. У кватэры Хілінскага *«вісеў партрэт у авальнай раме. Пісаны пад старую манеру. Нават лакам крыты. Партрэт прадзёрты ля ніжняга закруглення рамы: ірваная рана, кімсьці грубавата зашытая і па-аматарску зафарбаваная. На партрэце жанчына ў чорнай з чырвоным сукенцы. І сама чарнявая, відавочна, паўдзённага тыпу.*

*Заўсёды, калі я заходзіў да Хілінскага, мяне здзіўляў гэты партрэт. Ніколі яшчэ мне не даводзілася бачыць такі значны жаночы твар. І такі прыгожы адначасова. Вачэй не адарвеш. І напаўадкрыты рот, і горды нос і лоб, і ўся гэтая пяшчотна-ганарлівая, дасканалая стаць. О, пане мой божа!»*

Аднойчы Хілінскі адкрывае Антону Космічу таямніцу гэтага партрэта: на ім ягоная жонка, таленавітая спявачка, па нацыянальнасці цыганка. У час вайны яе закатавалі фашысты ў канцэнтрацыйным лагеры, і сын іх знік... Магчыма, паколькі нарадзіўся бялявенькі, «нардычнага тыпу», быў аддадзены на выхаванне ў Германії і ніколі не даведаецца, хто і адкуль ён. Хілінскі не можа змірыцца са сваёй трагедыяй. *«Якая была Грушанька ў «Зачараваным вандроўніку», якая Маша ў «Жывым трупе»! Спявала — плакалі людзі. І за гэта — яр. За ўсё — яр».*

### ЯН ПРЫГОЖЫ І БАЛОТНЫ ЎЛАДАР

Галоўны герой апавядання «Ідылія ў духу Вато» — мастак... Ён адмаўляецца ад кахання, таму што смяротна хворы і не хоча псаваць жанчыне, якая яго кахае, жыццё. Але адбываецца апошняе спатканне, і мастак паказвае любай свае карціны. Адна называецца «Радзіма»: *«Усё было проста: насычанае чырвоным неба, барвовы адбітак у спакойнай вадзе, схіленая пад уласным цяжарам вадзяная чараціна, што перакрэсліла палосу. Рабілася шкода чагосьці, нешта пагражала, нараджалася ў сэрцы няўмольная любоў». Другая называецца «Вайна» — «пакрыўлены рог дома, акно, з якога, як сцяг, вырывалася фіранка, — відаць, па пакоях гуляла пройма — і двух сабак, якія пілі ваду пад дзіраваю рынай. Убаку трэці пёс, пужліва азіраючыся, капаў сабе ў зямлі нару».* Трэцяя прысвечана каханню: *«Бязмежная роўнядзь вады, сусветны патоп, а над ёю юнак, што ўздымаў на руках непрытомную дзяўчыну. Вада ўсё прыбывала, і на твары юнака можна было чытаць: «Любая, дыхай, пакуль мае вусны не зніклі пад вадой».*

А самая ўражлівая прысвечана барацьбе жыцця і смерці:

*«На новым палатне быў лес, светла-зялёная, пранізаная сонцам папараць. І ў ёй, бы ў зялёных аблоках, быццам зусім не дакранаючыся да зямлі, сутыкнуліся два магутныя кані, счапіліся ў апошняй стычцы два коннікі.*

*Гэта было зроблена з такою дзікай экспрэсіяй, з такім драматызмам, што міжвольна прыхodзіла думка: адзін з іх, той, што ў чорным, нікуды не ўцячэ.*

*Гэта Ян Прыгожы дабіваў Балотнага Уладара».*

Вельмі важны вобраз для Караткевіча... У рамане «Леаніды не вернуцца да зямлі» яго альтэр эга — паэт Грынкевіч піша пра сябе: *«Таму, што не быў я спакойнай травой, / А быў удалым, Як Ян Прыгожы: / Ў стрэмя нагой ці аб пень галавой».*

Шкада, што апісаных майстрам слова карцін не існуе, — затое дзякуючы яго майстэрству мы можам іх дакладна ўявіць. А словы Караткевіча спаконвек будуць натхняць мастакоў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61 |

**Предмет аукциона – оборудование (бывшее в употреблении), реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская область, г. Барановичи, ул. Наконечникова, 50**

**1. Машина формовочная DISAMATIC 2110 MK3** (ID № 97.2704) в составе: формовочная машина; стержнеукладчик; электронная панель оператора PLC; два конвейера; лестницы и площадка обслуживания.
**2. Бункер (формовочной смеси)** с отводным конвейером и воронкой

| | |
|---|---|
| **Начальная цена** | **329 280,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %** |

**Задаток в размере 27 440,00 бел. руб.** перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок заключения договора купли-продажи:** 20 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в размере 100 % в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Если победителем признается участник – нерезидент РБ, то оплата предмета аукциона может осуществляться в валюте (доллар, евро, российский рубль) по официальному курсу НБРБ на дату проведения платежа

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.01.2023** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.01.2023** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 280-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### извещает о внесении изменений в извещение о проведении аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу

ЛОТ № 1:
- капитальное строение, инв. № 431/С-11599 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание цеха по производству хлебобулочных и кондитерских изделий), общей площадью 977,0 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Пионерская, 29;
- капитальное строение, инв. № 431/С-13266 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада), общей площадью 190,1 кв. м, расположенное по адресу: Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Пионерская, 29;
- оборудование: стол циркулярный; котел газовый; счетчик газа; клапан; шкафной регуляторный пункт; насос; насос; насос; бак-расширителя; шкафной регуляторный пункт; фильтр; шкаф распределительный; вводное устройство; распределительное устройство; насос; насос; шкаф расстоечный; горелка блочная; щит автоматический; щит автоматический; щит автоматический; печь для хлебопечения; горелка блочная; бак водомерный; печь РТ-150; кондиционер; кондиционер; кондиционер; корректор к газовому счетчику; котел паровой ВХ-200; автомат контроля герметичности с клапаном эл.; напольный чугунный котел; напольный чугунный котел; каскадный регулятор котлов; теплосчетчик ТС-05 «Струмень»; котел газовый напольный «Гризли», Proterm, 85 KLO.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355700001001105, площадью 0,4664 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий специализированных для производства продуктов питания, включая напитки и табака (хлебопекарня)) по адресу Кореличский р-н, г. п. Мир, ул. Пионерская, 29.

Начальная цена продажи – 326 102,59 руб. (триста двадцать шесть тысяч сто два рубля пятьдесят девять копеек) с учетом НДС.

Сумма задатка – 32 610 руб. (тридцать две тысячи шестьсот десять рублей)

**Аукцион состоится 30.12.2022 г.**
**Последний день приема заявлений – 28.12.2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок**
**55-87-71 – Гродненский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**http://grino.by/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638 |
| **Продавец** | ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70. УНП 100770618. Тел.: +375 29 6139869 |

**Предмет повторного аукциона**

**Лот № 1**

**Ограждение бетонное** (инв. номер 980773).
Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 2 119,22 долл. США**
Шаг аукциона – 105,96 долл. США

**Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70**

**Лот № 2**

**Административное, производственное** (2007,2 кв. м, 500/С-21619). В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,3600 га** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 728 697,60 долл. США**
Шаг аукциона – 36434,88 долл. США

**Лот № 3**

Состав лота: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. № 30121)

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 2 434,20 долл. США**
Шаг аукциона – 121,71 долл. США

**Лоты №№ 4–10 – оборудование, бывшее в употреблении**

| Лот № | Наименование | Нач. цена (с НДС), долл. США | Шаг аукциона*, долл. США |
|---|---|---|---|
| 4 | **Аппарат гидроабразив. резки (инв. № 70103)** | **21 018,00** | 1050,90 |
| 5 | **Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124 (инв. № 70124)** | **18 361,20** | 918,06 |
| 6 | **Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4 (инв. № 41028)** | **13 276,83** | 663,84 |
| 7 | **Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133 (инв. № 70179)** | **286 092,04** | 14304,60 |
| 8 | **Станок отрезной ДОС (инв. № 41012)** | **129,60** | 6,48 |
| 9 | **Робот промышленный KUKA KR 150 со шкафом управления и соединит. кабелями** | **17 887,00** | 894,35 |
| 10 | **Профильный проектор Helios 350H** | **7 021,85** | 351,09 |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводятся за счет покупателя

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **ipmtorgi.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона –** не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере; **по лотам №№ 1–8 – 3 %, по лоту № 9 – 5 %, 10 – 7 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала аукциона: 23.12.22 в 13.00**
по адресу: г.Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б.
**Заявки** на участие **принимаются по 22.12.2022 до 17.00**
по тому же адресу

**Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

## Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 11 января 2023 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Унитарному предприятию «Химтранс» на праве хозяйственного ведения

| | |
|---|---|
| **Лот № 1:** | **Мини-трактор CATMANN XD-300, рег. знак ЕК-3 3379,** год выпуска – 2016. Цвет: зеленый. Заводской номер: 816040840. Двигатель: дизель, 35 л. с. Состояние: хорошее, технически исправен. Шины в хорошем состоянии. Установлено дополнительное оборудование в виде фронтального погрузчика. **Начальная цена лота: 14 640,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %). **Задаток: 1 464,00 рублей** (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |

**Местонахождение автотранспортного средства:**
Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 10.01.2023 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **11.01.2023 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 10.12.2022 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 5 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47, сайт: ino.by, e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: Унитарное предприятие «Химтранс», г. Гомель, ул. Химзаводская, 5, тел.: +375 232 49-22-71, 49-26-21.**
**Контактное лицо: Масейков Сергей Сергеевич, +375 29 121-38-68 – по рабочим дням с 7.30 до 16.30.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2022.Б.002.00149

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **Открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов»,** УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска

Номер лота, вид выставляемого на первые повторные электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество.**

**Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождение (№ 1/07-2022):**

Кап. строение с инв. № 500/С-48495, площадью 685,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/47, наименование: ремонтно-строительный цех; назначение: здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 500/С-31587, площадью 20,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/48, наименование: здание сварочной: РСЦ; назначение: здание специализированное для производства строительных материалов. Кап. строение с инв. № 500/С-48494, площадью 95,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/44, наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-31589, площадью 4,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/45, наименование: надворный туалет – РСЦ; назначение: здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 500/С-30045, площадью 24 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/46, наименование: склад для маляров – РСЦ; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ.

Вышеуказанные кап. строения расположены на зем.участке с кадастровым № 500000000006004362 площадью 16,0587 га по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47 (общее долевое право постоянного пользования). Покупателю переходит доля в праве постоянного пользования зем. участка с кадастровым № 500000000006004362, из расчета площади для обслуживания объектов 3800,42 кв. м;

**Начальная цена:** 277 200,00 бел. руб. без НДС.

**Минимальная цена**: 166 320,00 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 1:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение объектов движимого имущества на общую сумму **96542,77** бел. руб. без НДС. Ознакомиться с перечнем имущества можно на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ – «Недвижимое имущество».

**Условия первых повторных электронных торгов:** Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение торгов, и оплатить услуги оператора ЭТП; возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов в сумме 5685,20 бел. руб. без НДС, подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества (оборудования) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи. Демонтаж, погрузка и вывоз имущества осуществляется за счет Покупателя в срок, указанный в договоре купли-продажи.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: **28.12.2022 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ **по 16.00 27.12.2022.**

Для участия в первых повторных электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 27.12.2022.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме **27720,00** (двадцать семь тысяч семьсот двадцать рублей 00 копеек) белорусских рублей должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация:

Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 17 374 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов: +375 44 793 73 06.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) в рабочих дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества (г. Минск, ул. Я. Мавра, 47).

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/ до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




З рэктарам Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта, акадэмікам, доктарам сельскагаспадарчых навук, прафесарам Вітольдам Казіміравічам Песцісам я пазнаёміўся раней, чым з яго ўніверсітэтам. ВНУ сельскагаспадарчага профілю ў Горках, Мінску, Віцебску і Гродне своеасаблівыя і па сваёй структуры, і па арганізацыі навучальнага працэсу. Яны «прыземленыя», маюць у сваёй гаспадарцы ўчасткі зямлі, мехдвары і фермы, доследныя ўчасткі і ветлякарні, пасекі і лясныя ўгоддзі. З іх патрабуюць не толькі падрыхтоўку спецыялістаў для работы на вёсцы, але і селекцыю жывёл, новыя гібрыдныя сарты раслін і высокія ўраджаі ў вучэбных гаспадарках. Таму і падначальваюцца гэтыя ВНУ не Міністэрству адукацыі, а Міністэрству сельскай гаспадаркі. Зразумела, што ў першы час работы міністрам адукацыі мне было не да іх, і з Песцісам я грунтоўна пазнаёміўся перш за ўсё як з палітыкам, а ўжо пасля ацаніў маштаб гэтай асобы і як рэктара.

У 2004 годзе прыхільнікі Прэзідэнта Беларусі А. Р. Лукашэнкі на Гродзеншчыне вырашылі аб'яднацца, стварыўшы грамадскую арганізацыю «Белая Русь». Гэты палітычны рух быў заканамерным: праціўнікі Прэзідэнта, яго апазіцыя, арганізаваны ў партыі і ўсялякія грамадскія структуры, а мы, прыхільнікі, не. Маўляў, нас і так абсалютная большасць — навошта нам яшчэ і нейк структуравацца? Аднак эфектыўная палітычная работа патрабуе яе арганізаванасці — вось у Гродзенскай вобласці і ўзнікла «Белая Русь». І, відаць, самымі актыўнымі яе арганізатарамі сталі намеснік старшыні аблвыканкама Марыя Міхайлаўна Бірукова і... рэктар Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта Вітольд Казіміравіч Песціс. Іх ідэя аказалася настолькі своечасовай і запатрабаванай, што ў 2007 годзе была створана рэспубліканская арганізацыя «Белая Русь» і мяне выбралі яе старшынёю. З таго часу мы з Вітольдам Казіміравічам неразлучныя. Ён часта бываў у мяне ў міністэрстве, пры гэтым не толькі як рэктар, але і як член Савета Рэспублікі (дарэчы, трох скліканняў!). Мы сустракаліся і ў Акадэміі навук, дзе я быў членам прэзідыума, а ён — членам-карэспандэнтам, а пасля — правадзейным членам. Абласныя арганізацыі «Белай Русі» ўзначалілі нашы з Песцісам калегі-рэктары, таму і ў рэспубліканскім штабе гэтай арганізацыі нашы размовы ад палітычных тэм непазбежна пераходзілі да пытанняў развіцця вышэйшай школы і ўвогуле адукацыі ў краіне. Але ж Прэзідэнт мяне так і скіроўваў: «Сістэма адукацыі — перадавы ідэалагічны фронт!»

З Вітольдам Казіміравічам у мяне размовы заўсёды былі грунтоўныя і глыбокія. Любілі мы гутарыць удвух. Аб стратэгіі развіцця сельскай гаспадаркі, аб праблемах ў сістэме вышэйшай школы, аб празмернай карпаратыўнасці ў Акадэміі навук, аб партыйным будаўніцтве. Нашы гутаркі былі настолькі даверлівыя, што не пра ўсё я і сёння магу расказваць. Мне падабалася яго жыццялюбства, заўсёды ўласцівы яму аптымізм. І ўсе рэктары, і ўся «Белая Русь» не раз слухалі з яго вуснаў установку на жыццё:

*Не знаю, сколько жить еще*
*осталось,*
*Но заверяю вас, друзья:*
*Работу можно отложить*
*на старость*
*Любовь на старость отложить*
*нельзя.*

Аўтарытэт рэктара Песціса грунтоўны і маштабны, Вітольд Казіміравіч уяўляе з сябе ў маім разуменні аптымальнае спалучэнне асабістых якасцяў для гэтай пасады — палітык, вучоны, педагог, гаспадарнік і проста добры чалавек. Таму і кіруе сваім універсітэтам з 1995 года да сёння.

Гродзенскі медыцынскі ўніверсітэт таксама з'яўляецца бастыёнам нашай краіны на заходніх граніцах, але ўжо ў ахове здароўя. Ён быў адчынены ў 1958 годзе для забеспячэння медыцынскімі кадрамі заходняга рэгіёна Беларусі. Я добра ведаў двух рэктараў гэтага ўніверсітэта — доктара медыцынскіх навук, прафесара Пятра Васільевіча Гарэліка і члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук, доктара медыцынскіх навук, прафесара Віктара Аляксандравіча Сняжыцкага. Але, відаць, яшчэ больш — першага прарэктара гэтага ўніверсітэта, доктара медыцынскіх навук, прафесара Ігара Георгіевіча Жука. Рэктары медыцынскіх універсітэтаў адрозніваліся ад сваіх калег, кіраўнікоў іншых ВНУ вонкавым спакоем, саліднасцю, нават нейкай дыстанцыянаванасцю ад жыццёвай мітусні і прыкметнай незалежнасцю. Мяркую, таму, што ўсе яны былі ўрачамі-практыкамі, пры гэтым даволі добрымі. Ведалі сабе цану. Бо, як бы перад ім ні гарачыўся начальнік, нават знешне маглі вызначыць, што ў яго, напрыклад, хворыя ныркі, ці гіпертанія, ці пачынаецца праступнае захворванне, і ён ужо прыйдзе да іх жа на прыём у прасцецкім выглядзе, здыме перад імі пінжак і кашулю (і гэта ў найлепшым выпадку). Ды і мы да іх рэгулярна звярталіся з просьбамі дапамагчы ў лячэнні сябе ці блізкіх. Я, напрыклад, яшчэ гадоў пятнаццаць назад спытаў у прафесара Жука:

— Ігар Георгіевіч, ці трэба штогод прышчэплівацца ад грыпу? Мы ж не навучыліся прадугледжваць яго новыя штамы і ўсё адно можам захварэць.

— Абавязкова! Па-першае, гэта дае большую верагоднасць выжыць у час эпідэміі. Па-другое, нават калі са штамам мы не ўгадалі, усё адно хвароба будзе працякаць мякчэй.

Заўважце, ні я, ні ён тады і падумаць не маглі, што да нас прыйдзе нават не эпідэмія, а пандэмія каранавіруса.

Віктар Аляксандравіч Сняжыцкі быў прызначаны рэктарам, калі я ўжо не працаваў міністрам адукацыі. Але нас цягнула адзін да аднаго. Калі мы траплялі ўдвух на які-небудзь палітычны ці адукацыйны форум, то абавязкова знаходзілі адзін аднаго, каб перакінуцца хоць бы словам. Гэта было для нас неабходна. Ён запрашаў мяне ў свой універсітэт выступіць перад студэнтамі па пытаннях сучаснай дзяржаўнай ідэалогіі. Не атрымалася. І я адчуваю сваю віну перад ім.

Паважлівае стаўленне да рэктара Сняжыцкага было не толькі ў яго ўніверсітэце, у сістэме аховы здароўя і ў Акадэміі навук. Гродзенцы абралі яго сваім прадстаўніком і ў Савет Рэспублікі.

Першы прарэктар медыцынскага ўніверсітэта прафесар Жук у 2009 годзе быў прызначаны намеснікам старшыні аблвыканкама, а ў 2014-м яго выбралі старшынёю абласнога Савета дэпутатаў. Рэктары і прарэктары ўніверсітэтаў па ўсёй краіне працягваюць забяспечваць кадравы рэзерв кіраўнікоў краіны і яе рэгіёнаў.

З Ігарам Георгіевічам мы ўжо сталі больш разам працаваць у палітычнай сферы. Ён са сваімі калегамі часта прыязджаў на нарады ў Адміністрацыю Прэзідэнта, на пасяджэнні Савета Рэспублікі, членам якога быў. І, вядома ж, усе нашы размовы непазбежна датычыліся яго роднага Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта. У 2018 годзе Ігар Георгіевіч узначаліў абласную арганізацыю «Белай Русі». Так ці інакш, і грамадскія лідары фарміруюцца, як правіла, ва ўніверсітэтах.

З 2020 года Гродзенскі ўніверсітэт узначальвае яго выпускніца, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Алена Мікалаеўна Краткова (*цяпер — першы намеснік міністра аховы здароўя Беларусі* — **заўв. рэд.**). Алена Мікалаеўна — з практыкуючых дактароў і арганізатараў сістэмы аховы здароўя. Участковы доктар, намеснік галоўнага ўрача, галоўны ўрач абласной бальніцы, начальнік упраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама — цяпер яна са сваім багатым вопытам у якасці рэктара будзе рыхтаваць новыя пакаленні дактароў для нашай краіны.

Тры гродзенскія ўніверсітэты — нашы заходнія фарпосты ў навуцы, адукацыі, медыцыне і сельскай гаспадарцы. А разам — і ў нацыянальнай ідэалогіі. Рэктары ўніверсітэтаў заўсёды разумелі сваё прызначэнне для гэтых задач і з годнасцю іх вырашалі.

...Яшчэ са школы мяне непакоіла пытанне: чаму на тэрыторыі Беларусі Тураўскае княства самае старажытнае? Зразумеў гэта тады, калі прыехаў у Тураў, і там мне расказалі, што ў гэтых мясцінах самыя ўрадлівыя глебы на нашай тэрыторыі. Тады я задумаўся: Радзівілы пасяліліся ў Нясвіжы, першая ў нашай краіне сельскагаспадарчая ВНУ была арганізавана ў Горках. А там таксама вельмі добрая зямля! У Магілёўскай вобласці цэлая града, якая працягнулася ад Мсціслаўскага праз Горацкі, Шклоўскі і Круглянскі раёны. Аднойчы я ад усёй душы віншаваў губернатара Брэсцкай вобласці Канстанціна Андрэевіча Сумара з высокім ураджаем збожжавых:

— І надвор'е ў гэтым годзе было не самае лепшае, а вы сабралі мільён тон!

А ён толькі ўздыхнуў:

— А калі б мне яшчэ такая зямля, як у вас у Магілёўскай вобласці!

Горы-Горацкая земляробчая школа (цяпер Беларуская (Горацкая) сельскагаспадарчая акадэмія, БСГА) — сельскагаспадарчая навучальная ўстанова Расійскай імперыі — была заснавана 24 красавіка 1836 года. З таго часу яе кіраўнікамі былі многія вартыя вучоныя і педагогі. Напрыклад, яшчэ са сваіх студэнцкіх гадоў памятаю прозвішча рэктара БСГА Сонцава. У Магілёўскім пединстытуце мае выкладчыкі вымаўлялі яго з непрыхаванай павагай. Пазней я даведаўся, чаму.

Акадэмік УАСГНІЛ, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар Канстанцін Міхайлавіч Сонцаў — вядомы вучоны фізіёлаг. Ён быў рэктарам БСГА з 1964 да 1977 года. Распрацоўваў тэарэтычныя асновы рацыянальнага кармлення буйной рагатай жывёлы і свінняў, методыкі захоўвання кармоў, тэхналогіі вытворчасці і выкарыстання кармавых антыбіётыкаў. Рэзультаты яго даследаванняў адразу выкарыстоўваліся ў мяса-малочнай прамысловасці. Да гэтага часу яго імя ў Горацкай акадэміі вымаўляюць з піетэтам.

Пасля акадэміка Сонцава БСГА два гады ўзначальваў вядомы вучоны-генетык і селекцыянер, член-карэспандэнт АН БССР, доктар біялагічных навук, прафесар Усевалад Яўстаф'евіч Бормачаў. Вынікі яго даследаванняў пшанічна-жытнёвых гібрыдаў, паліплоідных сартоў цукровых буракоў і цяпер выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 17 снежня.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5, 12, 26 лістапада, 3 снежня.)*

---

З нагоды

# На хвалі часу

## Часопіс «Полымя» святкуе 100-гадовы юбілей



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры здзейсніў падарожжа ў мінулае. Адпраўным пунктам стала круглая дата, якая святкуецца ў гэтым снежні, — 100-гадовы юбілей часопіса «Полымя». Падчас урачыстага адкрыцця літаратурна-дакументальнай экспазіцыі «...І зноў на хвалі часу. Нязгасныя знічкі «Полымя» наведвальнікам распавялі пра айчынныя літаратурныя суполкі XX стагоддзя, прыгадалі паэтак, якія стваралі незвычайныя і прагрэсіўныя вершы ў міжваенны перыяд, а таксама паказалі кадры кінахронікі беларускай кінастудыі.**

**Дырэктар дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей УСІК** распавёў, што канцэпцыя выставы — магчымасць перанесціся на сто гадоў назад:

— Мы спадзяёмся, што дзякуючы экспазіцыі вы апынецеся ў віры грамадска-палітычных падзей, якія адбываліся ў нашай краіне. А таксама па-новаму асэнсуеце тое, што рабілі нашы літаратары.

Літаратурна-дакументальная экспазіцыя была створана музеем у супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім домам «Звязда». Экспанаты адлюстроўваюць 1920—1930-я гады адразу з некалькіх бакоў. Напрыклад, можна прачытаць вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага, убачыць асабістыя рэчы пісьменнікаў, прадметы іх гардэробу. Адлюстравана і творчасць паэтак, якія друкаваліся ў 20-я гады мінулага стагоддзя: Наталлі Вішнеўскай, Зінаіды Бандарынай, Яўгеніі Пфляўмбаум. Таксама дэманструюцца і фондавыя анкеты літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што ўражвае як сама выстава, так і гісторыя часопіса «Полымя»:

— Традыцыя выдання тоўстых часопісаў у Беларусі, нягледзячы ні на якія складанасці, захавалася. Сёння самае частае пытанне ад журналістаў, асабліва электронных сродкаў масавай інфармацыі, звязана з фарматам мастацкіх тэкстаў: што прасцей — выкладаць іх у анлайн-прастору або захоўваць у папяровым варыянце, няхай і невялікімі накладамі. Для мяне шмат важнейшая прысутнасць мастацкага слова на паперы, таму што ёсць магчымасць адрэдагаваць, захаваць навідавоку. Хацелася б, каб з гэтым разуменнем часопіс жыў і надалей развіваўся.

Алесь Карлюкевіч падкрэсліў, што «Полымя» ў розныя часы было выданнем, якое фарміравала асобы, прычым у дастаткова маладым узросце:

— Хацелася б, каб моладзь ішла ў часопіс: бачыла яго сваім і арыентавалася на традыцыі, а разам з тым генерыравала новыя «палымянскія» старонкі.

У экспазіцыю ўвайшлі ўсе юбілейныя нумары, а таксама ўзнагароды часопіса. Ёсць і насычаны амажамі на творы беларускай літаратуры верш «Прайсці праз «Полымя», які напісаў **паэт, галоўны рэдактар «Полымя» Віктар ШНІП.** Куратары нават прыдумалі невялікі інтэрактыў: трэба прачытаць верш і падлічыць, колькі назваў вядомых твораў, якія ў свой час друкаваліся ў «Полымі».

— Хачу падзякаваць Музею гісторыі беларускай літаратуры за цудоўную імпрэзу, за выставу, якая будзе працаваць яшчэ доўгі час. Сто гадоў — гэта не толькі гісторыя беларускай літаратуры, але і гісторыя нашай краіны. Усе значныя творы нашай літаратуры прайшлі праз «Полымя», — адзначыў Віктар Шніп.

Наведаць выставу і пазнаёміцца з літаратурнай эпохай міжваеннага перыяду можна да 25 лютага 2023 года.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# «АДБЫЎСЯ ТЭНІСНЫ БУМ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Кацярына, у 2017 годзе вы былі ў эпіцэнтры арганізацыі фіналу Кубка Федэрацыі ў Мінску. Што згадваецца праз пяць гадоў?***

— Шчыра прызнацца, я не веру, што прайшло пяць гадоў. Такое ўражанне, што ўсё гэта было ўчора. У псіхалогіі ёсць такое паняцце, як «посттраўматычны сіндром». А ў нашай каманды — «постфінальны сіндром». Здаецца, ён не прайшоў і па сёння. Колькі было праведзена работы, колькі наладжана новых камунікацый, колькі мы прайшлі выклікаў, колькі людзей было аб'яднана з мэтай правесці гэта мерапрыемства на самым высокім узроўні — гэта ўражвае. Прысутнічаў кіраўнік дзяржавы, кіраўнікі Міжнароднай тэніснай федэрацыі, Жаночай тэніснай асацыяцыі, топ-менеджары кампаній-спонсараў — гэта была вялікая падзея не толькі для спорту, але і для краіны. Было вельмі адказна працаваць над арганізацыяй такога турніру, але я вельмі ўдзячная за гэты досвед. За больш чым дзесяць гадоў працы ў тэнісе я такога яшчэ не сустракала. Але самае галоўнае і самае класнае — гэта людзі, каманда ад кіраўніка аргкамітэта да валанцёраў. Усю гэтую прыгажосць і гісторыю зрабілі людзі. І такі захапляльны матч — літаральна пара памылак на тай-брэйку вырашылі яго вынік. Нашы дзяўчаты тады стварылі гісторыю.

Я вельмі ўдзячная нашым тэнісістам за тое, што яны заўсёды адгукаліся на запрашэнне выступіць за краіну. У 2017 годзе адзін за адным ішлі матчы Кубка Дэвіса, Кубка Федэрацыі і потым фінал у лістападзе. Самы галоўны вынік гэтай гонкі — прыток новых людзей у тэніс. Іх стала ў разы больш. Дзеці сталі цікавіцца тэнісам, бацькі павялі іх у секцыі. Тыя, хто ўжо займаўся, сталі трэніравацца больш сур'ёзна, убачылі, якіх вышынь можна дасягнуць. Колькасць праглядаў трансляцый матчаў у інтэрнэце паказала, што больш людзей стала сачыць за тэнісам. Стала больш і тых, хто вырашыў займацца тэнісам як хобі. Здарыўся своеасаблівы тэнісны бум. І гэта выдатна.

**«Магчыма, патрэбна нейкая школа для спартыўных прэс-сакратароў, для людзей, якія займаюцца інфармацыйным суправаджэннем».**

***— Калектыў Беларускай тэніснай федэрацыі правядзеннем фіналу задаў вельмі высокую планку. Але на такім узроўні вельмі цяжка замацавацца...***

— Той год нас многаму навучыў, было шмат спрэчных момантаў, цяжкасцяў. І гэты досвед стаў вельмі карысным падчас пандэміі, крызісу, у сённяшніх умовах, калі нашых спартсменаў адхіляюць ад міжнародных стартаў. Мы аказаліся гатовыя да выклікаў. Да ўсіх гэтых цяжкасцяў нашу працу высока ацэньвалі. У 2019 годзе Tennis Europe прызнала Беларусь краінай, якая дынамічна развіваецца ў тэнісе. Мы задалі вельмі высокую планку і апусціць яе не можам.

***— Атрымліваецца, што, акрамя брэнда беларускіх тэнісістаў, існуе і брэнд Беларускай тэніснай федэрацыі?***

— Нясціпла, але можна і так сказаць. Тэнісісты на кортах, федэрацыя ў офісе робяць адну справу — развіваюць і папулярызуюць тэніс. Федэрацыя наўрад ці можа дапамагчы ў развіцці асабістага брэнда Арыны Сабаленкі ці Максіма Мірнага — там і без нас усё добра. Але федэрацыя тэніса можа і павінна дапамагаць развіццю брэнда маладых перспектыўных спартсменаў. Дапамагчы ў заваёўванні прыхільнасці аматараў праз наш афіцыйны сайт і сацыяльныя сеткі, дапамагчы з пошукам спонсараў.

Ужо трэці раз мы праводзім турнір на прызы Аляксандры Сасновіч, яна сама па магчымасці на яго прыязджае, сустракаецца з дзеткамі-ўдзельнікамі. І кожны, каму Саша пакінула аўтограф ці зрабіла сэлфі, будзе і далей сачыць за яе поспехамі. Асабісты брэнд працуе. Вікторыя Азаранка праводзіла майстар-класы, кэмпы для дзяцей. Арына Сабаленка рэгулярна праводзіць майстар-клас для вучняў сваёй роднай школы «Змена». Беларуская тэнісная федэрацыя актыўна дапамагае ў правядзенні мерапрыемстваў. І ўсё гэта працуе на развіццё брэнда не толькі самога спартсмена, але і федэрацыі ў цэлым.



З камандай Кубка Федэрацыі.

***— Зразумела, што на майстар-клас Вікторыі Азаранкі ці Арыны Сабаленкі дзеці пойдуць натоўпам. А што наконт пакуль не такіх медыйных, але вельмі перспектыўных тэнісістаў?***

— Наша задача — павышаць іх медыйнасць, актыўна расказваць пра іх поспехі. Менавіта з такой мэтай Беларуская тэнісная федэрацыя запускае новы праект пад агульнай назвай «Мытэніс». Мы плануем расказваць пра нашых спартсменаў і іх першых трэнераў, паказваючы, што вялікім тэнісістам можа стаць кожны. У рамках праекта па ўсёй краіне будуць размешчаны білборды з беларускімі тэнісістамі. Спадзяюся, што білборды з фота Аляксандры Сасновіч, Крысціны Дзмітрук і іншых гульцоў натхняць дзяцей, гэта стане для іх добрай матывацыяй. Гэтая рэкламная кампанія беларускага тэніса стартуе ў снежні.

***— Матывацыя дзяцей — гэта вельмі добра, але неабходны і ўмовы, асабліва ў рэгіёнах. Як вырашаецца гэтае пытанне?***

— Гэта наш галаўны боль. Вялікая праблема тэніса — матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, корты. Наш клімат не дазваляе тэнісістам трэніравацца круглы год на вуліцы, таму неабходныя крытыя корты, што патрабуе нямала сродкаў. Паступова праблема вырашаецца. Сёння тэніс нядрэнна развіваецца ў Мінску, Гомелі, Гродна. Стаіць задача ахапіць Віцебск і Брэсцкую вобласць, пабудаваць корты там. Сёлета мы ўдзельнічалі ў фестывалі «Вытокі», аб'ехалі ўсе рэгіёны і ўбачылі вялікую зацікаўленасць дзяцей і іх бацькоў у нашым відзе спорту. Але пакуль упіраемся ў корты.

***— Кацярына, як на беларускі тэніс уплывае тое, што цяпер спартсмены хоць і не адхілены ад міжнародных стартаў, але там не ўказваецца краіна, якую тыя прадстаўляюць?***

— Пасля Алімпійскіх гульняў 2012 года, калі Максім Мірны і Вікторыя Азаранка сталі чэмпіёнамі ў міксце, увесь свет убачыў, хто такія беларускія тэнісісты. З песні слоў не выкінеш. Усё ведаюць, што Арына Сабаленка, якая сёння ўваходзіць у топ-5 сусветнага рэйтынгу, родам з Беларусі. Так, зараз няма сцяга перад прозвішчам нашых тэнісістаў, але ўсе і так ведаюць, адкуль яны. Галоўнае, што нашых спартсменаў не адхілілі ад турніраў. Гэта вельмі важна для іх саміх і для маладога пакалення тэнісістаў. Вельмі цяжка знаходзіць матывацыю, калі перад вачыма няма прыкладу выступленняў куміра. І, на жаль, цяпер мы бачым адток маладых спартсменаў, якія з'явіліся ўсе гэтыя гады. Таму нам трэба старацца як мінімум захаваць тую моладзь, якая ўжо займаецца тэнісам.

***— Беларускія тэнісісты адхілены ад удзелу ў камандных турнірах Кубка Дэвіса і Кубка Білі Джын Кінг. Ці ёсць магчымасць, каб яны выступалі ў гэтых спаборніцтвах, але пад нейтральным сцягам, калі і так усе ведаюць, адкуль яны?***

— Гэты момант прапісаны ў Статуце Міжнароднай тэніснай федэрацыі. Там сказана, што прымаць удзел у Кубку Дэвіса і Кубку Білі Джын Кінг могуць толькі краіны — члены гэтых арганізацый. Паколькі наша членства ў ITF прыпынена, мы нават пад нейтральным сцягам не можам выступаць. Хоць у мінулым годзе расійская каманда перамагла ў Кубку Дэвіса, выступіўшая пад нейтральным сцягам з-за допінгавых праблем. Шанцы на вяртанне нашых тэнісістаў ёсць. Мы чакаем рашэння Міжнароднага арбітражнага суда па нашай справе супраць Міжнароднай тэніснай федэрацыі наконт аднаўлення нашых правоў і сімволікі. І яшчэ адзін варыянт — падчас фіналу Кубка Дэвіса будзе праходзіць штогадовая генеральная канферэнцыя ITF — мы спадзяёмся, што адным з пытанняў стане вяртанне нашай краіны як мінімум у членства міжнароднай федэрацыі.



З Арынай САБАЛЕНКАЙ.

***— Кацярына, доўгі час вы займалі пасаду прэс-сакратара Беларускай тэніснай федэрацыі. У чым асаблівасці інфармацыйнага развіцця свайго віду спорту?***

— З 2009 года, калі я пачала працаваць у тэніснай федэрацыі, і да сёння кардынальна змяніліся інструменты работы. Думаю, тое заўважыў кожны. Сёння я магу весці сайт і сацыяльныя сеткі федэрацыі з кожнага пункту зямнога шара, і гэта дапамагае. Але з'яўляецца іншая задача — пастаянна быць у трэндзе, быць на крок наперад. Асноўныя тэндэнцыі інфармацыйнага суправаджэння: аператыўнасць, трэнды для кожнай аўдыторыі і статыстыка. З аператыўнасцю ўсё зразумела. У ідэале сайт тэніснай федэрацыі павінен першым даваць навіны аб выступленні сваіх спартсменаў. Гэта цяжка, але мы стараемся. Далей — трэнды. У кожнай аўдыторыі свае пажаданні. Адны любяць кароткія паведамленні, другім патрэбныя разборы матчаў, трэцім — інтэрв'ю са спартсменамі. Трэба адчуваць сваю аўдыторыю і задавальняць яе патрабаванні. Ну а наколькі эфектыўна тое атрымліваецца, пакажа статыстыка праглядаў, рэпостаў, колькасць каментарыяў. І гэта ж датычыцца не толькі спартыўнай сферы, але і любой іншай, якая прасоўвае сябе ў інтэрнэце. Калі вярнуцца да тэніса, то сёння яму цяжка канкурыраваць не столькі з іншымі відамі спорту, колькі з іншымі актыўнасцямі. Асабліва ў моладзі, якая ў інфармацыйнай прасторы бачыць безліч усяго цікавага. І самае складанае — прыцягнуць іх увагу да тэніса.

***— У такім выпадку, калі ў Беларускай тэніснай федэрацыі, якая мае старонкі ва ўсіх сацыяльных сетках, з'явіцца акаўнт у TikTok?***

— Так, сёння гэта самая трэндавая рэч, самая папулярная пляцоўка. Але для яе неабходны яркі, незвычайны кантэнт, каб аўдыторыя зацікавілася. Калі б у нас цяпер праходзілі буйныя міжнародныя спаборніцтвы — мы б з задавальненнем здымалі цікавыя ролікі з найлепшымі тэнісістамі, яны б не засталіся без увагі. Але пакуль няма такой магчымасці. Дарэчы, аб рабоце з моладдзю. Мне вельмі падабаецца кейс калег з хакейнага клуба «Дынама-Мінск» і іх «Аддзел трэндаў». Запрасіць дзяцей папрацаваць у клубе — смела і арыгінальна. У іх можна многаму павучыцца ў плане маркетынгу і інфармацыйнага суправаджэння.

***— Хакейны клуб можа праводзіць маркетынгавую палітыку: ён прадае білеты на матчы, мае свой мерч. Спартыўнай федэрацыі з такім цяжэй...***

— А гэта чэлендж, які стаіць перад спартыўнымі федэрацыямі: зрабіць так, каб стаць камерцыйна паспяховым прадуктам. Праўда, давядзецца мяняць і кадравую палітыку, і юрыдычныя аспекты. Гэта глабальная перабудова. Але заўсёды можна пачаць з сябе. Федэрацыя можа зрабіць камерцыйна паспяховым адзін турнір, знайсці спонсараў. Мы цяпер працуем над такім праектам, які стартуе ў пачатку наступнага года. І, вяртаючыся да брэнда спартсмена і федэрацыі, без моцнага брэнда спартсмена і федэрацыі тое зрабіць складана. І, зноў жа, усё ўпіраецца ў інфармацыйнае суправаджэнне.

***— Ёсць ідэі, як яго развіваць?***

— Я чытаю лекцыі ў БДУФК спартыўным менеджарам і бачу, што дадзены кірунак ім вельмі цікавы. Магчыма, патрэбна нейкая школа для спартыўных прэс-сакратароў, для людзей, якія займаюцца інфармацыйным суправаджэннем. У нас прэс-сакратары не толькі арганізоўваюць работу з прэсай на мерапрыемствах — яны яшчэ і спічрайтары, фатографы, дызайнеры. І маладым спецыялістам такая школа дапамагла б.

***— Кацярына, ад глабальных тэм да штодзённых. У мінулым месяцы прайшоў фінал рэспубліканскага турніру «Залатая ракетка». Якія ўражанні засталіся ў арганізатараў?***

— «Залатая ракетка» — адзін з самых паспяховых прыкладаў аб'яднання нашых спартсменаў, павышэння матывацыі юных тэнісістаў. Сёлета ўдзельнічала рэкордная колькасць камандаў — 15. Самае галоўнае — змяніўся фармат, мы прыблізілі яго да фармату правядзення летняга і зімовага чэмпіянатаў Еўропы. Сёлета нашы гульцы на ім не выступаюць і, на жаль, не могуць адчуць той камандны дух. Але мы далі ім такую магчымасць у «Залатой ракетцы». Столькі станоўчых водгукаў мы не чулі, мабыць, з фіналу Кубка Федэрацыі. Дзеці мэтанакіравана рыхтаваліся да турніру. Гэта ўжо мерапрыемства са сваім брэндам, і тут таксама пункт росту. Мы плануем павялічыць колькасць удзельнікаў. І на наступны, юбілейны, год — сабраць прадстаўнікоў усіх школ: своеасаблівы зрэз нашага маладога пакалення.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**

# КРЫВАВЫ ХАОС НА РАЙСКІМ ВОСТРАВЕ



## Што адбываецца на Гаіці?

**Не менш чым 12 чалавек загінула днямі ў выніку бойні, учыненай узброенай бандай у населеным пункце Кабарэ побач з Порт-а-Прэнсам, сталіцай Гаіці. Пра гэта паведаміла агенцтва навін Prensa Latina. Мясцовыя жыхары распавялі пра членаў банды, якія на працягу некаторага часу спрабавалі кантраляваць раён. Паліцыя праследавала злачынцаў, яны ўцяклі, але пазней вярнуліся. Бандыты пачалі забіваць людзей і спальваць дамы. Пасля ўчыненай бойні знойдзена 12 цел, у тым ліку жаночае. Некаторыя трупы спаленыя. «Бандыты дзейнічалі з неймавернай жорсткасцю», — заўважыў кіраўнік мясцовай адміністрацыі Жозеф Джынсан Гіём. Паводле яго слоў, неабходна ўзмацніць праваахоўныя структуры ў раёне, каб гарантаваць бяспеку насельніцтва. Як вядома, паліцыя краіны не ў стане справіцца з узброенымі бандамі, якія кантралююць вялікія тэрыторыі. Што адбываецца на Гаіці?**

### КРАІНА Ў РУІНАХ

Усе краіны Карыбскага басейна зарабляюць турызмам. Гаіці — гэта 1700 кіламетраў прыгожага марскога ўзбярэжжа, аднак яго рэсурс амаль зусім не выкарыстоўваецца. Суседняя Ямайка — буйны вытворца баксітаў і алюмінію, Дамініканская Рэспубліка, якая займае ўсходнюю частку вострава, здабывае золата. У Гаіці радовішчы баксітаў не меншыя, чым на Ямайцы, а золата — чым у Дамінікане, але іх не вырабляюць. Гэта найбяднейшая краіна Заходняга паўшар'я, якая ў асноўным жыве на грашовыя пераводы ад мігрантаў і гуманітарную дапамогу. Казаць аб гаіцянскай эканоміцы не варта: яе проста не існуе — хіба толькі дробны гандаль і мізэрнае па маштабах земляробства, адзначаюць vedomosti.ru. Затое квітнее злачынны абарот: развіваецца транзіт наркотыкаў, які, праўда, у апошнія гады моцна пацярпеў з-за ўзмацнення дзейнасці антынаркатычных падраздзяленняў ЗША, Калумбіі і Венесуэлы.

Палітычная і дзяржаўная сістэмы ў Гаіці за 200 гадоў так і не склаліся. Краіна дасюль не акрыяла ад жахлівага землятрусу 2010-га. Тады яе скаланула так, што, акрамя каласальных ахвяр (загінула 222 тысячы чалавек), былі разбураны амаль увесь жыллёвы фонд, усе суб'екты эканомікі і ўся лагістыка. Аднаўляць краіну не было каму і на што: мясцовых інвестараў няма, а замежным злашчасная Гаіці зусім не цікавая. Астраўная дзяржава так і жыве ў руінах. Работы няма зусім, парадку — таксама.

Пандэмія вельмі балюча ўдарыла па бедных краінах, у тым ліку па Гаіці: паменшылася гуманітарная дапамога, раз'ехаліся ўрачы-добраахвотнікі і супрацоўнікі сіл ААН, якія падтрымлівалі хоць нейкі парадак. Малалікая паліцыя і вайсковыя падраздзяленні ахоўваюць адміністрацыйныя будынкі і ўласныя казармы, у той час як уся астатняя тэрыторыя Гаіці апынулася пад кантролем узброеных бандаў.

### ЦЁМНАЯ ГІСТОРЫЯ

Апошні дзеючы прэзідэнт Гаіці Жавенэль Маіз быў забіты ўзброенымі людзьмі ў ліпені мінулага года. Паліцыя абвінаваціла ў тым калумбійскіх наёмнікаў, каля 20 з якіх пасля было арыштавана. Але больш чым праз год ніхто не паўстаў перад судом — ні за забойства, ні за яго заказ і арганізацыю.

Праваабаронцы сцвярджаюць, што згаданай справай займаліся (і пасля адмовіліся займацца) ужо чацвёра суддзяў, цяпер яна знаходзіцца ў руках пятага.

Хто стаяў за тым злачынствам — няясна да гэтага часу. Нібыта беспрацоўныя калумбійскія баевікі былі нанятыя нейкім доктарам-гаіцянінам, што жыве ў ЗША, з прычыны асабістай непрыязнасці да Маіза. Але ў выніку забойства ўлада ў краіне перайшла да прэм'ер-міністра Арыеля Анры, якога Маіз паспрабаваў зняць з пасады непасрэдна перад гібеллю. Пасля такой цёмнай гісторыі дзяржструктуры Гаіці канчаткова перасталі працаваць.

Забойства прэзідэнта стварыла вакуум улады, які спрабуюць запоўніць банды. Праваабаронцы сцвярджаюць, што па ўсёй шматпакутнай краіне налічваецца каля 200 узброеных груповак, больш за палову з іх — у сталіцы. Банды захапілі партовыя тэрміналы, крыніцы вады, харчовыя і паліўныя склады, устанавілі блокпасты на дарогах і ключавых аб'ектах гарадоў. Насельніцтва цяпер атрымлівае тую ж гуманітарную дапамогу не ад адпаведных арганізацый, а ад бандытаў. Бальніцы закрыліся, прадпрыемствы і транспартныя службы спынілі работу. Навучальны год у Гаіці так і не пачаўся: настаўнікі і дзеці баяцца бандытаў. Аслабелыя ад голаду і пазбаўленыя медыцынскай дапамогі гаіцяне пачалі паміраць ад халеры. Зняволеныя ў турмах паміраюць з голаду.




Стваральнікам бандаў у Гаіці лічаць колішняга прэзідэнта Арыстыда Жан-Бертрана, які быў скінуты ў 1991 годзе падчас ваеннага перавароту, але здолеў пры дапамозе ЗША вярнуцца да ўлады ў 1994-м. Ён распусціў войска і пачаў узбройваць жыхароў трушчоб, на якіх аказваў уплыў у бытнасць каталіцкім святаром. У сваю чаргу, палітычныя апаненты Арыстыда Жан-Бертрана ўзброілі сваіх прыхільнікаў. Так у краіне з'явіліся нелегальныя групоўкі.

Паводле звестак гаіцянскіх праваабарончых груп, узброеныя банды фактычна захапілі не менш чым 60 працэнтаў сталіцы краіны і яе наваколля. Яны трымаюць горад у аблозе, кантралюючы дарогі да яго, паведаміла «Бі-бі-сі». Паводле даных ААН, са студзеня да чэрвеня бягучага года ахвярамі бандаў стала больш за тысячу чалавек.

Па сутнасці, дзяржаўны апарат на Гаіці не функцыянуе. Тут сёння няма кіраўніка дзяржавы, не функцыянуе парламент (банды кантралююць тэрыторыю вакол яго), а прэм'ер-міністр Арыель Генры, які падтрымліваецца ЗША, не быў фармальна абраны на пасаду і не карыстаецца папулярнасцю, адзначыла «Бі-бі-сі». Амаль палова насельніцтва — 4,7 мільёна з 10 мільёнаў гаіцян — недаядае. З іх 1,8 мільёна чалавек знаходзіцца ў надзвычайным становішчы, паводле прынятай міжнароднай супольнасцю шкалы ацэнкі ўзроўню голаду. У ЮНІСЕФ папярэджваюць, што жыццё амаль ста тысяч дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў пад пагрозай. Яны знясіленыя ад недаядання і ўспрымальнасці да любой інфекцыі, а на фоне ўспышкі халеры гэта асабліва небяспечна.

### «БАРБЕКЮ» І ІНШЫЯ

Дзеянні ўзброеных банд — найгоршая з напасцяў, сцвярджаюць праваабаронцы. Выкраданне людзей — індустрыя, якая пашыраецца на востраве. Паводле даных ААН, сёлета са студзеня да кастрычніка, было зарэгістравана 1107 выпадкаў выкраданняў. Для некаторых банд гэта асноўная крыніца даходу. Выкуп можа складаць ад 200 да мільёна долараў. Калі ён заплачаны, большасць ахвяр вяртаюцца дадому жывымі, але зусім не цэлымі. «Мужчын збіваюць, жанчыны і дзяўчынкі падвяргаюцца групавому згвалтаванню, — адзначыла «Бі-бі-сі» Гедэон Жан з гаіцянскага Цэнтра аналізу і даследаванняў у галіне правоў чалавека. — Гэта падганяе сваякоў хутчэй знайсці грошы для выкупу. Часам выкрадальнікі тэлефануюць ім, каб тыя паслухалі, як усё адбываецца з іх роднымі».

Эксперты сцвярджаюць, што ўзброеныя групоўкі маюць сувязі з карумпаванымі палітычнымі дзеячамі — як у дзейнай уладзе, так і ў апазіцыі. Тыя забяспечваюць банды зброяй, фінансамі ці палітычнай абаронай. Узамен банды выконваюць «брудную працу», па неабходнасці правакуючы страх, нестабільнасць ці, наадварот, падтрымку тых ці іншых палітыкаў. Багатыя бізнесмены, як лічыцца, таксама маюць сувязі з бандамі. «Паміж палітыкамі і некаторымі бандамі заўсёды існавалі сувязі, у асноўным у бедных кварталах са шматлікім электаратам. Але пасля выбараў 2011 года гэтыя адносіны выйшлі на новы ўзровень — банды выкарыстоўваюцца як субпадрадчыкі для стварэння палітычнага гвалту», — кажа Джэймс Боярд, эксперт па бяспецы і прафесар міжнародных адносін у Дзяржаўным універсітэце Гаіці.

Калі член банды арыштаваны, для яго вызвалення (прычым з адабранай пры арышце зброяй) бывае дастаткова тэлефоннага званка. «Судовых спраў няма, — заўважае Мары Розі Агюст Дзюсена, прадстаўнік Нацыянальнай сеткі абароны правоў чалавека Гаіці (RNDDH). — Суддзі не жадаюць працаваць з гэтымі справамі. Ім плацяць банды. А некаторыя паліцэйскія падтрымліваюць банды, даюць ім нават браніраваныя машыны і слёзатачывы газ».

Некаторыя паліцэйскія самі знаходзяцца ў бандах, кажа праваабаронца Гедэон Жан: «Мы ведаем, што ў кожнай бандзе ёсць як мінімум два дзеючыя або былыя паліцэйскія. Мы ведаем, што для выкраданняў выкарыстоўваюцца машыны з паліцэйскімі нумарамі. Ці датычная да гэтага паліцыя як інстытут, мы не ведаем».

Некаторыя дзейныя і былыя паліцэйскія маюць уласную банду. Праваабаронцы сцвярджаюць, што яна кантралюе частку галоўнай вуліцы ў цэнтры Порт-а-Прэнса. Дачыненне сілавікоў да дзеянняў банд не з'яўляецца таямніцай. Зарплата сярэдняга паліцэйскага рэдка перавышае 300 долараў у месяц, а некаторыя жывуць у кварталах, якія кантралююцца бандамі. Для іх гэта пытанне выжывання, а не выбару.

Большая частка аднаго з найбяднейшых раёнаў сталіцы Сітэ-Салей кантралюецца самай магутнай крымінальнай федэрацыяй у Порт-а-Прэнсе G9 і яе саюзнікамі. Мясцовыя крыніцы сцвярджаюць, што яна цесна звязана з забітым прэзідэнтам і яго кіруючай партыяй, а яе спецыялізацыя — вымагальніцтва. У верасні G9 заблакіравала галоўны паліўны тэрмінал у горадзе, што паралізавала краіну амаль на два месяцы і выклікала гуманітарны крызіс. Яе лідар — былы афіцэр паліцыі Джымі Чарызье па мянушцы «Барбекю», які іншы раз нават праводзіць прэс-канферэнцыі. Праўда, на адпраўленую праз пасрэднікаў прапанову пагутарыць з «Бі-бі-сі» ён не адказаў. Магчыма, справа ў тым, што нядаўна Савет Бяспекі ААН наклаў на яго санкцыі, абвінаваціўшы ў пагрозе міру і стабільнасці на Гаіці.

Злучаныя Штаты і Канада нядаўна ўвялі асобныя санкцыі супраць двух гаіцянскіх палітыкаў, уключаючы дзейнага старшыню Сената Джозефа Ламберта, за магчымае супрацоўніцтва з бандамі. Эксперты мяркуюць, што санкцыі аказваюць пэўны ўплыў, таму што палітыкі, якія абвінавачваюцца ў сувязях з бандамі, часова затаіліся.

### КЛЮЧ ДА ВЫРАШЭННЯ

У Арганізацыі Аб'яднаных Нацый гавораць аб неабходнасці адпраўкі на востраў узброеных сіл, не звязаных з ААН, — апошняя місія міратворцаў запомнілася абвінавачваннямі ў сексуальным гвалце, а таксама тым, што міратворцы з Непала завезлі на Гаіці халеру, адзначае «Бі-бі-сі». У выніку той эпідэміі загінула каля 10 тысяч чалавек. Аднак узначаліць такія сілы ці хоць бы прыняць у іх удзел пакуль ніхто не спяшаецца.

Прапанова генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша аб аказанні гэтай краіне падтрымкі ў стварэнні бяспекі патрабуе ўважлівага вывучэння. Аб гэтым на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН заявіў намеснік пастаяннага прадстаўніка КНР пры арганізацыі Гэн Шуан, паведаміў ТАСС. Паводле слоў дыпламата, Кітай гатовы падрабязна абмяняцца меркаваннямі па гэтым пытанні з іншымі бакамі. «Мы прынялі да ўвагі нядаўні заклік прэм'ер-міністра Гаіці аб накіраванні ў краіну спецыяльных сіл. Мы таксама прынялі да ўвагі неадкладнае супраціўленне прысутнасці замежных узброеных сіл у Гаіці з боку некаторых палітычных партый і груп», — сказаў Гэн Шуан.

Звярнуўшы ўвагу на тое, што разгортванне міжнародных сіл можа не атрымаць аднагалоснай падтрымкі з боку палітычных сіл краіны і нават справакаваць супраціўленне з боку насельніцтва, ён адзначыў, што гэта «трэба разглядаць комплексна і ставіцца да іх з асцярожнасцю». «Ключ да вырашэння пытання Гаіці знаходзіцца ў руках самога гаіцянскага народа. Міжнародная супольнасць павінна зыходзіць з доўгатэрміновай перспектывы, падтрымліваючы гаіцянскі народ у пошуках усёабдымнага і ўласнага рашэння, заснаванага на яго ўласнай унікальнай сітуацыі», — лічыць кітайскі дыпламат.

Тым часам стала вядома, што новую палітычную партыю для выратавання «паміраючай» краіны стварыў экс-міністр замежных спраў Гаіці Клод Жозеф. Аб гэтым паведаміла іспанскае інфармагенцтва Europa Press. Палітык заявіў, што спадзяецца прыцягнуць у сваю партыю моладзь, якая, паводле яго слоў, не даверае старым лідарам. Жозеф наракае на тое, што краіна «надзвычай падзелена» з-за «карумпаванай сістэмы», якая дзейнічае не ў інтарэсах людзей. Па словах былога міністра, ва ўладзе знаходзяцца алігархі, якія кантралююць практычна ўсе галіны, і менавіта яны паставілі цяперашняга прэзідэнта Арыэля Анры ўзначальваць Гаіці. Экс-міністр сцвярджае, што Анры датычны да забойства прэзідэнта Гаіці ўлетку мінулага года. Ён звярнуўся да міжнароднай супольнасці з просьбай уключыць прэм'ер-міністра ў «чорны спіс» людзей, якія знаходзяцца пад санкцыямі. У той жа час Жозеф выступіў супраць ініцыятывы ААН, звязанай з увядзеннем у Гаіці замежнага кантынгенту для барацьбы з узброенымі бандамі. Паводле яго слоў, трэба павышаць патэнцыял гаіцянскай паліцыі з дапамогай «добра навучаных, добра аплачваемых і добра аснашчаных» падраздзяленняў, паколькі ў адваротным выпадку яны не могуць супрацьстаяць узброеным групам.

Вядома, усё гэта — толькі дэкларатыўныя заявы і да рэальных змяненняў да лепшага ў шматпакутнай краіне яшчэ вельмі далёка. На жаль, пакуль крывавы хаос на райскім востраве толькі пашыраецца.

Захар БУРАК.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона**

**Административно-бытовой корпус № 2 с проходной**
(назначение: здание административно-хозяйственное, общ. пл. 304,1 кв. м, 500/С-39010).
Адрес**: г. Минск, ул. Машиностроителей, 18/1**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0656 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 28.02.2025) для обслуживания здания административно-хозяйственного. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0195 га)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 133 200,00 долларов США**

**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)*

**Задаток в сумме 30 000,00 бел. руб.** перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск) БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 19.05.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 26.12.2022 в 13.00. Окончание торгов: 26.12.2022 в 14.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.12.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Добрушского РайПО (продавец) извещает о проведении **20 декабря 2022 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 4:** капитальное строение с инв. № 311/С-52038 площадью 294,8 кв. м, наименование: магазин, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321255700001000569 площадью 0,6512 га (право постоянного пользования), по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, гп. Тереховка, ул. Советская, 36/2

**Начальная цена** без НДС – 8 970,00 бел. руб.

**Задаток** без НДС – 897,00 бел. руб.

Расходы по изменению границ земельного участка, необходимого для обслуживания предмета аукциона; приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Добрушское районное потребительское общество**, г.п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел. +375 29 690-00-10.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 19.12.2022 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно заключенному договору купли-продажи . Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении **27 декабря 2022 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена: 1 193 630,40 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 119 363,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, код платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

